Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №112 (28476)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Страціў зрок, але не апусціў рукі

Я навучу сына біцца…

Гісторыі ў лістах-успамінах

СТАР. 15

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:

«У нас шмат зроблена ў сферы аховы здароўя, але яшчэ далёка не ўсё. Дзесьці не хапае прафесіяналізму, дзесьці адстаём тэхналагічна. Аб'ектыўных прычын шмат. І задача ўлады, аб'яднаўшы намаганні з прафесіяналамі сваёй справы, спецыялістамі-медыкамі, — як мага хутчэй ліквідаваць недахопы, узняць якасць медыцынскай дапамогі да таго ўзроўню, які хочуць бачыць нашы людзі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.06.2017 г.

Долар ЗША	1,8771 ▲
Еўра	2,1048 ▲
Рас. руб.	0,0329 ■
Укр. грыўня	0,0721 ▲

ISSN 1990 - 763X

НА ДАРОЖКУ…



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выпускнікі 16-й школы горада Полацка каля Барысавага каменя, які знаходзіцца на высокім беразе Дзвіны побач з Сафійскім саборам. Здавён лічылася, што рэліктавы валун валодае незвычайнай энергетыкай, якая спрыяе чалавеку ў яго духоўным жыцці, напаўняе цела здароўем. Перад паступленнем у навучальныя ўстановы полацкія выпускнікі заўсёды прыходзяць да запаветнага каменя, каб іх мары і надзеі спраўдзіліся.

■ Шлях па Беларусі

КАРМІЦЬ — СМАЧНА, ЗАПРАЎЛЯЦЬ — ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЮ

Рэальнасць і будучыня прыдарожнага сэрвісу

Сёння адкрыць кафэ непадалёк ад трасы можа практычна кожны, а пляцоўку для гэтага можна выбраць у інтэрнэце. Аднак намеснік начальніка ўпраўлення бытавога абслугоўвання і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Ларыса КАМАРОВА папярэджвае: адкрываць падобны аб'ект — рызыкова. Тэма сучаснага стану і перспектыў развіцця прыдарожнага сэрвісу была абмеркавана на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

СТАР. 4

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ У свеце

Жахлівая ноч

У Лондане згарэў 24-павярховы жылы дом

Надзвычайнае здарэнне адбылося ў Вялікабрытаніі. Як мінімум шэсць чалавек загінулі, дзясяткі пацярпелі ў выніку моцнага пажару, які шмат гадзін бушаваў у шматпавярховым жылым доме на захадзе Лондана. У момант узнікнення агню ў 24-павярховым будынку Грэнфел-таўэр магло знаходзіцца да 600 чалавек.

newsru.com

Як паведамляе сайт Рускай службы ВВС, у Лонданскую пажарную брыгаду ў 00.54 ночы ў сераду паступіў званок з паведамленнем аб агні ў жылым доме Грэнфел-таўэр на вуліцы Лацімер-Роўд у раёне Паўночны Кенсінгтан. На месцы тушэння пажару працавалі 40 пажарных разлікаў і больш за 200 пажарных. Больш за 20 карэт «хуткай дапамогі» прыбылі да будынка, які быў ахоплены агнём з другога па апошні паверхі.

Што да прычыны пажару, то яна пакуль не вызначана. Ёсць версія, што ўсё адбылося з-за халадзільніка, які ўзарваўся. Спецыялісты называюць здарэнне беспрэцэдэнтным. Многія пажарныя, якія аддалі прафесіі ўсё жыццё, не сутыкаліся з падобным ніколі.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Тры пытанні да ўлады

КУРС НА МОЦНУЮ ЭКАНОМІКУ

Касцюковіцкі раён вядомы дзякуючы Беларускаму цэментнаму заводу, лясгасу і шэрагу іншых эфектыўна працуючых прадпрыемстваў. Апошнім часам тут дастаткова дынамічна развіваецца сацыяльная сфера — узводзяцца гандлёвыя цэнтры, жыллё, спартыўныя аб'екты. Сёлета ў Касцюковічах быў цалкам здадзены фізкультурна-аздараўленчы комплекс агульнай плошчай больш за 6 тысяч квадратных метраў, што дало магчымасць вырашыць адразу некалькі праблем — павялічыць экспарт турыстычных паслуг, стварыць новыя працоўныя месцы і забяспечыць раён добрай спартыўнай базай. Зроблены шэраг захадаў па паляпшэнні прадукцыйнасці працы і своечасовай выплаце заработнай платы. Адбыліся станоўчыя зрухі і ў развіцці прыватнага бізнесу. Больш падрабязна на гэты конт мы пагутарылі з намеснікам старшыні Касцюковіцкага райвыканкама па эканамічных пытаннях Любоўю КІСЯЛЁВАЙ.

— Другая чарга ФАКа ўступіла ў дзеянне зусім нядаўна, 26 красавіка. Наколькі запатрабаваным аказаўся гэты аб'ект і ці можна ўжо сёння казаць пра нейкі ўплыў яго на эканоміку раёна?

— Толькі дзякуючы кіраўніку краіны Аляксандру Лукашэнку, губернатару Магілёўскай вобласці Уладзіміру Даманеўскаму і старшыні Магілёўскага аблсавета на той момант, а цяпер памочніку Прэзідэнта па Мінскай вобласці Анатолю Ісачанку сёлета для завяршэння будаўніцтва была выдзелена канчатковая сума па «чарнобыльскай» праграме. На будоўлю спартыўнага комплексу былі накіраваны таксама сродкі раённага суботніка. І, што хочацца падкрэсліць, больш за 2,1 мільёна рублёў на гэты аб'ект сабралі нашы прадпрыемствы і жыхары. Цяпер мы маем доўгачаканы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр з універсальнай спартыўнай залай для гульнявых відаў спорту з трыбунамі на 750 месцаў, басейнам на 5 дарожак даўжынёй 25 метраў, трэнажорнай залай, заламі для заняткаў фітнесам, боксам, дзюдо. Касцюковіцкі раён заўсёды ганарыўся сваімі спартсменамі, асабліва ў дзюдо і цяжкай атлетыцы. Дастаткова ўспомніць сярэбранага прызёра Алімпіяды ў Рыа-дэ-Жанэйра Вадзіма Стральцова. Летась наш раён праславіла яшчэ і юная самбістка Анфіса Капаева, якая заваявала серабро на Кубку свету ў Маскве. Што датычыцца басейна, то тут нават і сумнявацца не трэба ў яго запатрабаванасці. У нас шмат моладзі, за апошнія гады ў Касцюковічах вырас цэлы жылы маладзёжны мікрараён. Адпаведна і нараджальнасць расце. Раней, каб школьнікі маглі здаць нарматыў па плаванні, мы іх вазілі ў Клімавіцкі раён. А зараз графік складзены так, каб кожная школа, у тым ліку сельская, магла паўнавартасна займацца. Створаны групы сярод працоўных калектываў, ужо нават прайшло некалькі раённых спаборніцтваў паміж рознымі арганізацыямі. Праводзяцца спаборніцтвы сярод школьнікаў. Прыязджаюць наведвальнікі з Хоцімскага раёна, з суседняга Суражскага раёна Расійскай Федэрацыі. Адным словам, комплекс працуе з раніцы да позняга вечара. У нас адчувальна павысіўся экспарт турыстычных паслуг, а галоўнае, у два разы па першым квартале было перавыканана заданне па стварэнні працоўных месцаў. І на 50% гэта звязана з уводам у эксплуатацыю ФАКа.

— Раён з'яўляецца адным з сямі, якія, згодна з Указам 235, увайшлі ў праграму развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Як працуе гэты закон? Ці ёсць чым тут пахваліцца?

— Нядаўна быў пабудаваны 60-кватэрны дом, у якім 27 грамадзян атрымалі льготны крэдыт пад 1% гадавых. У рамках гэтага ж закона запрацаваў аб'ект грамадскага харчавання на 50 пасадачных месцаў. Развіваецца прыватны бізнес, укладаюцца грошы ў сферу паслуг. Сёлета ў Касцюковічах запрацаваў сучасны гандлёвы цэнтр «Востраў чысціні» плошчай 255 квадратных метраў. Яшчэ адну вельмі запатрабаваную краму будаўнічых матэрыялаў адкрыў індывідуальны прадпрымальнік. Яе плошча 204 квадратныя метры. Гаспадар паклапаціўся, каб быў прывабны дызайн, якасна аформленыя вітрыны, высокі сэрвіс абслугоўвання.

Дзякуючы беларуска-нямецкім інвестарам развіваецца альтэрнатыўная энергетыка. Першая станцыя магутнасцю 1,5 МВт ужо ўведзена ў эксплуатацыю. І, што вельмі прыемна, спрацавала дастаткова прыбыткова, нягледзячы на тое, што быў не сонечны квартал. Разлічваем на добрыя дывідэнды і ў далейшым. Яшчэ на тэрыторыі будуюцца 2 станцыі па 1,5 МВт кожная. Адну з іх плануецца запусціць ужо сёлета.

— На якім узроўні знаходзіцца ў раёне выкананне прагнозных паказчыкаў? У чым атрымалася дасягнуць больш спрыяльных вынікаў?

— Сёлета станоўчыя тэндэнцыі замацаваліся ў розных галінах эканомікі. У 1-м квартале плённа працавалі па прасоўванні прадукцыі за межы краіны. У сувязі з паляпшэннем кан'юнктуры на рынку цэменту, павялічыўся аб'ём яго экспарту ў Расію. Сёлета пачалі ажыццяўляць пастаўкі гэтага будаўнічага матэрыялу ва Украіну, а таксама вярнуліся на рынак Калінінградскай вобласці. Усяго за першы квартал адгружана на экспарт больш за 135 тысяч тон цэменту на агульную суму 6,2 мільёна долараў ЗША — у 2,2 раза больш, чым за аналагічны перыяд летась. Усё гэта добра паўплывала на рост аб'ёмаў экспарту тавараў і паступлення валюты. Сёлета змаглі пераламаць сітуацыю па экспарце тавараў на прадпрыемствах, падпарадкаваных райвыканкаму і райсавету дэпутатаў — у 9 разоў перавысілі заданне 1-га квартала. На працягу апошніх некалькіх гадоў гэты паказчык быў у нас не ў лепшым стане. Нядрэнна развіваецца і экспарт паслуг. Калі летась гэта былі на 70% транспартныя, то сёлета ўпершыню быў наладжаны экспарт будаўнічых, а таксама, як я ўжо казала, за кошт уводу ў дзеянне басейна адчувальна павялічыўся экспарт турыстычных паслуг.

У першым квартале мы забяспечылі выкананне аб'ёму валавой прадукцыі сельскагаспадарчымі арганізацыямі, што не атрымлівалася зрабіць летась. Такая форма кантролю як абарона зарплаты дазволіла стабілізаваць сітуацыю на слабых прадпрыемствах. А ўкараненне ў сельскай гаспадарцы забытай формы — гаспадарчага разліку — дало стымул працаваць на вынік і гэтым забяспечваць своечасовую выплату заработнай платы. Матывацыя для ўсіх адна — зарплата абавязкова павінна быць зароблена. І мы няўхільна выконваем суадносіны паміж прадукцыйнасцю працы і зарплатай, каб не дапусціць «праядання» абаротных сродкаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

БЛІЖЭЙ ДА ПЕРШЫХ

За апошнія дзесяць гадоў Беларусь паднялася з 128-га на 37-е месца па рэйтынгу Doing Business Сусветнага банка. Пра гэта нагадаў кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Ян Чул КІМ на сустрэчы са старшынямі пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Дэпутатам былі прадстаўлены вынікі комплекснага даследавання эканамічнага развіцця нашай краіны. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ** адзначыў, што гэта вельмі важна, «паколькі менавіта ў дадзены момант разглядаюцца праекты нарматыўна-прававых актаў і прагнозу развіцця краіны на бліжэйшы год і на трохгоддзе».

Ян Чул Кім прапрацаваў у Беларусі тры з паловай гады і ў жніўні збіраецца пакінуць сваю пасаду. За гэты час ён даволі добра вывучыў стан эканомікі краіны і вось якія зрабіў вывады: «Я аптымістычна настроены адносна будучыні Беларусі. За апошнія два гады, калі эканоміка адчувала асаблівыя цяжкасці, нягледзячы на іх, назіраліся паслядоўныя макраэканамічныя рэформы. Глабальная эканоміка аднаўляецца пасля цэлага шэрагу перыядаў нізкіх узроўняў росту, і гэты момант з'яўляецца яшчэ адной магчымасцю для Беларусі, каб заявіць пра сябе на сусветным рынку».

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

■ Падзея

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ І ЭКСПАРТ

Танец трактароў, экскаватары, здольныя стаяць на аўтрыгерах (вынасных апорах) пад неймавернымі вуглами і забіваць каўшом тонкія цвікі... На прадпрыемстве «Амкадор» ведаюць, як здзівіць публіку. Менавіта так святкавалі адкрыццё холдынга «Амкадор-Семаш», што спецыялізуецца на выпуску машын і агрэгатаў для сельгасвытворцаў.

Плануецца, што ў вытворчай лінейцы холдынга будуць створаны сельскагаспадарчыя агрэгаты і машыны для апрацоўкі глебы, сяўбы, паліву і ўнясення ўгнаенняў, аховы раслін, уборкі збожжавых і зернебабовых, караня- і клубняплодаў, а таксама абсталяванне для пасляўборачнай апрацоўкі і захоўвання збожжа. У склад холдынга ўвайшлі прадпрыемствы «Амкадор-Можа» і «Амкадор-Семаш». Вядзецца таксама работа па ўключэнні ў холдынг «Амкадор-Двмз» і «Элезер». Усе ўдзельнікі арганізацыі ўяўляюць сабой адзіны тэхналагічны рад, пры гэтым кожны вырабляе сваю наменклатуру дэталяў, вузлоў і агрэгатаў машын «Амкадор».

У магутнасці па выпуску сельскагаспадарчых машын і агрэгатаў плануецца ўкласці больш за 150 млн долараў. Сума вялікая, але апраўдвае мэту — ідэя развіцця холдынга накіравана на дасягненне 100-працэнтнага імпартазамяшчэння і лакалізацыі вытворчасці на тэрыторыі краіны. Гэта азначае хуткае асваенне вытворчасці абсалютна ўсёй лінейкі сельскагаспадарчых машын, абсталявання і агрэгатаў, якія адпавядаюць сусветным стандартам.

Па словах **старшыні Савета дырэктараў «Амкадор» Аляксандра ШАКУЦІНА,** «Амкадор-Семаш» за тры гады павінен выйсці на аб'ём вытворчасці ў 100 млн долараў пры ўмове, што будуць хутка рэалізаваныя інвестыцыйныя праграмы, атрымаецца стварыць новыя прадпрыемствы і мадэрнізаваць заводы, якія ўваходзяць у склад холдынга. Пры гэтым ён падкрэсліў, што 50% прадукцыі будзе пастаўляцца на экспарт.

У невялікім раённым цэнтры будзе створана больш за тысячу працоўных месцаў, паведаміў **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.** Акрамя таго, заводы новага холдынга сфарміруюць канкурэнтнае асяроддзе для ўсёй галіны, дзякуючы таму, што вытворчасці, якія ўваходзяць у «Амкадор-Семаш», ствараюцца на самым сучасным тэхналагічным узроўні, купляецца найноўшае абсталяванне, прымяняюцца перадавыя тэхналогіі.

«Думаю, трэба і іншым нашым прадпрыемствам разумець, што месца хопіць усім і ў Беларусі, і за яе межамі, але трэба быць канкурэнтаздольнымі. Мы ж — краіна з адкрытай эканомікай, нам трэба 70% прадукцыі і паслуг прадаць на экспарт, каб жыць і развівацца», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Рэйтынг папулярнасці Трампа ўпаў да рэкордна нізкага ўзроўню

Рэйтынг незадаволенасці прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам абнавіў свой максімум, падняўшыся яшчэ на адзін працэнтны пункт, і дасягнуў 60%. Пра гэта сведчаць апублікаваныя вынікі апытання, арганізаванага сацыялагічнай службай Gallup International, якая вядзе даследаванне на штодзённай аснове. Паводле апошніх звестак, кіраўніка дзяржавы падтрымліваюць толькі 36% амерыканцаў. У красавіку сацапытанне, праведзенае The Washington Post сумесна з ABC News, паказала, што пасля 100 дзён прэзідэнцтва Дональд Трамп стаў адным з самых непапулярных амерыканскіх лідараў за ўсю гісторыю Злучаных Штатаў. Дарэчы, 14 чэрвеня гаспадару Белага дома споўніўся 71 год.

Напалоханыя брэксітам брытанцы накіраваліся па нямецкае грамадзянства

Рэкордная колькасць брытанцаў звярнулася па нямецкае грамадзянства. Па звестках нямецкага статыстычнага ведамства, летась 2865 падданых Злучанага Каралеўства падалі заяўку на атрыманне грамадзянства ФРГ. Годам раней такіх было ў тры з паловай разы менш. Акрамя таго, брытанцы таксама выказалі павышаную цікавасць да грамадзянства Італіі, Швецыі, Польшчы і Венгрыі. Калі Злучанае Каралеўства выйдзе з Еўрасаюза (відавочна, гэта здарыцца ў сакавіку 2019 года), то яго падданыя хутчэй за ўсё страцяць права жыць і працаваць у 27 краінах — членах міждзяржаўнага аб'яднання.

Калумбійскія паўстанцы здалі 60% узбраення

Калумбійская паўстанцкая групоўка «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі» (РУСК) здалі пад кантролем міжнароднай місіі ААН 60% свайго арсенала ў рамках выканання ўмоў мірнага пагаднення з урадам. Пра гэта паведаміў прэзідэнт Калумбіі Хуан Мануэль Сантас. «На наступным тыдні будуць здадзены ўсе 100%», — адзначыў ён. Прэзідэнт ахарактарызаваў пагадненне аб міры з РУСК як добра прадуманае і эфектыўнае.

Еўракамісія пачала расследаванне супраць Польшчы, Венгрыі і Чэхіі за адмову прыняць мігрантаў

Вынікам гэтай працэдуры могуць стаць буйныя грашовыя штрафы для краін-парушальніц. У якасці самай суровай меры пакарання, якая, зрэшты, яшчэ ні разу не ўжывалася, гэтыя дзяржавы могуць быць пазбаўлены права голасу ў Савеце ЕС. Увосень 2015 года краіны ЕС прынялі рашэнне аб рассяленні па сваёй тэрыторыі 160 тысяч мігрантаў. Квоты размяркоўваліся прапарцыйна насельніцтву краін ЕС і шэрагу іншых фактараў. За апошнія два гады Польшча і Венгрыя не прынялі ні аднаго мігранта, Чэхія ўзяла 12 чалавек.

Жахлівая ноч

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Лічылася, што Грэнфел-таўэр пабудаваны ў адпаведнасці з высокімі патрабаваннямі пажарнай бяспекі. Новыя ўваходныя дзверы ў кожную кватэру нібыта маглі вытрымліваць агонь да 30 хвілін, а гэтага цалкам дастаткова для прыбыцця пажарнай брыгады. Тым не менш на справе ўсё аказалася зусім па-іншаму. ВВС паведамляе: па словах некаторых жыхароў, агонь ахапіў увесь дом ужо праз 15 хвілін. Сведкі здарэння спачатку бачылі, як загарэлася кватэра на адным з паверхаў у ніжняй частцы вышыннага дома, але на іх вачах пажар імкліва распаўсюдзіўся па абліцоўцы будынка.

Ёсць і больш шакіруючая інфармацыя: відавочцы з суседніх дамоў распавялі, што бачылі людзей, якія падавалі сігналы аб дапамозе, у роспачы скакалі з верхніх паверхаў, выкідвалі ў вокны дзяцей, спрабавалі спусціцца па вяроўках, зробленых з прасцін.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Дапамогі на дзяцей да 3 гадоў будуць пераглядацца двойчы за год

Дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей да 3 гадоў, будуць пералічвацца двойчы ў год — з 1 лютага і з 1 жніўня. Калі сярэднямесячная зарплата работнікаў краіны, з якой вызначаецца памер дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, паменшыцца, дадзеная дапамога будзе назначацца і выплачвацца ў памеры, які быў вылічаны да змяншэння зарплаты.

Акрамя таго, сем'і з непаўналетнімі дзецьмі, у якіх бацькі з'яўляюцца інвалідамі першай або другой групы, а таксама сем'і, дзе адзін з бацькоў — інвалід першай групы, а другі ажыццяўляе яго догляд, будуць атрымліваць дапамогу на дзяцей старэйшых за тры гады да дасягнення імі 18 гадоў без уліку факта іх навучання ва ўстановах адукацыі на бясплатнай аснове.

Таксама бацькі, усынавіцелі або апекуны дзяцей-інвалідаў будуць атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ад 3 да 18 гадоў і ў тым выпадку, калі яны будуць працаваць няпоўны дзень або выконваць працу дома. Гэта дазволіць бацькам дзяцей-інвалідаў павысіць узровень даходу сям'і і выпрацаваць страхавы стаж для прызначэння працоўнай пенсіі. Дадзеныя асобы будуць мець права на гэтую дапамогу і ў выпадку атрымання імі пенсіі альбо штомесячнай страхавой выплаты.

Будзе павялічаны памер дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — на дзіця з трэцяй або чацвёртай ступенню страты здароўя. Пасля таго як яму споўніцца тры гады, гэта дапамога павялічыцца са 100% да 120% ад бюджэту пражыткавага мінімуму.

Права на дапамогу атрымаюць і цяжарныя жанчыны, якія сталі на ўлік да 12-тыднёвага тэрміну не толькі ў дзяржаўных, але і ў прыватных клініках.

Людзі, якія выхоўваюць дзяцей, будуць мець роўныя магчымасці па атрыманні сацыяльных дапамог незалежна ад іх рэгістрацыйнага ўліку, г. зн. не толькі па месцы пражывання, але і па месцы часовага знаходжання.

Большасць змен уступіць у сілу ўжо з 1 ліпеня. Змены, звязаныя з перараслікам памеру дзіцячых дапамог, уступяць у сілу з 1 жніўня.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

Папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, былі прынятыя дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні ў другім чытанні.

■ Падзея

ЖЫМ ПЛЮС ЦЯГА

Чэмпіянат свету па паўэрліфтынгу стартуе сёння ў Мінску

З 15 па 17 чэрвеня пройдзе турнір для ветэранаў, затым спаборніцтвы працягнуць юнакі і юніёры, а з 21-га па 25 чэрвеня на памостах выступяць прафесіяналы. Чэмпіянат прымае сталічны Палац спорту, спаборніцкая праграма штодня пачынаецца з 10 раніцы.

Удзел у турніры возьмуць амаль 900 спартсменаў з 52 краін, у Мінск прыедуць найманейшыя зборныя — з ЗША, Украіны, Расіі, Канады. Звычайна атлеты менавіта з гэтых краін збіраюць самы багаты ўраджай узнагарод на аналагічных турнірах. Беларускую зборную прадставяць 15 атлетаў. Найбольшыя надзеі ў гэтым відзе спорту сёлета ў нас звязваюць з сусветным рэкардсменам сярод моладзі па жыме лежачы Уладзіславам Папельскім, чэмпіёнкай свету 2016 года ў катэгорыі да 47 кг Таццянай Дамашынай, а таксама сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы гэтага года Сняжанай Зубко. На жаль, атрымаў траўму і не зможа прыняць удзел у гэтых спаборніцтвах заслужаны майстар спорту краіны па паўэрліфтынгу Аляксандр Грынкевіч-Суднік, у яго актыве ўжо ёсць чатыры перамогі на чэмпіянатах свету. У Мінску Аляксандр выступіць у якасці трэнера.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ДЗЕ ДАВЕДАЦЦА ПРА ПЕНСІІ?

Запрацаваў Нацыянальны інтэрнэт-партал сацыяльнай абароны

Сайт запусцілі, каб павысіць эфектыўнасць узаемадзеяння органаў і арганізацый сацыяльнай абароны з насельніцтвам. Тут можна знайсці інфармацыю пра пенсіі, дапамогі, іншыя выплаты і скарыстацца электроннымі паслугамі і сэрвісамі, звязанымі з сацыяльна-працоўнай сферай.

Так, на партале расказваецца пра паслугі і адміністрацыйныя працэдуры, парадак і ўмовы іх атрымання, асвятляюцца прававыя і арганізацыйныя пытанні дзейнасці органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. На сайце можна вылічыць прыкладны памер сваёй пенсіі, падаць электронны зварот і запісацца на прыём да спецыялістаў сферы, з дапамогай электроннага лічбавага подпісу заказаць шэраг паслуг, у тым ліку атрымаць пра сябе інфармацыю, зарэгістраваную ў Дзяржаўнай інфармацыйнай сістэме сацыяльнай абароны.

Пакуль што партал працуе ў тэставым рэжыме.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ВАЙНА НАГАДВАЕ ПРА СЯБЕ

У вёску Збураж Маларыцкага раёна сапёры прыбылі па выкліку з міліцыі. А ў міліцыю пазваніў мясцовы жыхар. Ён перакопваў уласны агарод і, нібы бульбу, даставаў адзін за адным жалезныя прадметы. Імі аказаліся мінамётныя міны часоў вайны. Спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы вывезлі з агарода фермера 48 мін калібру 81 міліметр і знішчылі іх на палігоне, паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні ўнутраных спраў.

А днём раней на тэрыторыі Баранавіцкай абутковай фабрыкі рабочы пры правядзенні земляных работ знайшоў боепрыпас. Гэтым разам давялося эвакуяваць больш за сто чалавек — супрацоўнікаў фабрыкі. Спецыялісты вывезлі з двара прадпрыемства снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны і знішчылі небяспечны груз.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

БРАКАНЬЕРА З ВОСТРАВА БРАЛІ З АМАПам

У затрыманага — «букет» злачынстваў

Парушальніка, які займаўся незаконным рыбалоўствам, затрымалі на Светлагорскім вадасховішчы. Бралі яго ў тым ліку і байцы АМАПа, бо гэты персанаж меў багатую крымінальную біяграфію...

50-гадовы мужчына, грамадзянін Расіі, што пражываў на тэрыторыі Беларусі, у мінулым неаднаразова прыцягваўся да адказнасці за розныя злачынствы — рабаванне, крадзеж, забойства. За што летась быў дэпартаваны і ўезд у нашу краіну яму быў забаронены на тры гады. Аднак грамадзянін тайком вярнуўся і асталяваўся на адным з астравоў Светлагорскага вадасховішча. Была інфармацыя, што ён лавіў рыбу сеткамі, апроч таго, абзавёўся абрэзам.

— На затрыманне выехалі 11 дзяржінспектараў са Светлагорска і тры супрацоўнікі гомельскага АМАПа. Раздзяліўшыся на групы, яны патрулявалі вадаём двое сутак. Падазраванага затрымалі, калі ён накіроўваўся ў бліжэйшую вёску са сваім незаконным уловам, здабытым пры дапамозе сетак і восцяў. Незаконныя прылады лоўлі потым знайшлі на востраве, як і зараджаны абрэз, — расказалі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету. — Мужчыну пагражае адказнасць адразу па трох крымінальных артыкулах — за незаконнае рыбалоўства, незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі і нелегальнае перасячэнне граніцы Беларусі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ЦЫЛІНДРЫ З ПЕРАВЫШЭННЕМ РАДЫЯЦЫЙНАГА ФОНУ

Ранкам у МНС паступіла паведамленне пра перавышэнне ўзроўню натуральнага радыяцыйнага фону пры правядзенні радыяцыйнага кантролю чыгуначнага вагона, гружанага дробленым металаломам, на тэрыторыі ААТ «Белдругчармет» у Гатаве.

Высветлілася, што пры праходжанні праз стацыянарную ўстаноўку радыяцыйнага кантролю чыгуначнага вагона зафіксавана перавышэнне ўзроўню натуральнага радыяцыйнага фону ў 17 разоў, на адлегласці аднаго метра радыяцыйны фон быў у норме.

Ратавальнікамі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС металалом быў выгружаны на адкрытую пляцоўку. Пры дапамозе спектрометраў праводзілася абследаванне грузу з вагона. Быў знойдзены металічны прадмет цыліндрычнай формы (даўжыня 10 см, дыяметр 3 см). Перавышэнне радыяцыйнага фону на яго паверхні было ў 250 разоў. Потым быў выяўлены другі металічны прадмет цыліндрычнай формы (даўжыня 8 см, дыяметр 3 см) з перавышэннем радыяцыйнага фону ў 100 разоў.

Крыніцы іанізуючага выпраменьвання перададзеныя для ўтылізацыі ва УП «Экарэс». Пацярпелых і пагрозы радыяцыйнага забруджвання навакольнага асяроддзя няма.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытые аукционы по продаже имущества в составе:

Имущество частного унитарного предприятия «Альфа Браво»: Стоимость снижена на 10%

№ Лота	Наименование объекта, сведения о земельном участке (площадь, кадастровый номер)	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Размер задатка (10 %), бел. руб.
1	**Здание столярной мастерской** общ. пл. 84,9 кв. м, инв. №630/С-58539, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623883901601000037 площадью 0,4415 га. **Здание арочника** общ. пл. 675,4 кв. м, инв. №630/С-58531, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623883901601000038 площадью 0,3793 га. Навес для хранения готовой продукции, забор (протяженность 233,5 м) Объекты расположены по адресу: Минская область, Молодечненский район, Граничский с/с, д. Горняки	30 800,09	3 080,00

Шаг аукциона – 10 (десять) процентов.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.

Задатки перечисляются на р/с 3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 18.05.2017.

Аукцион состоится **30.06.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2017** до **16.00** по указанному адресу.

Телефоны организатора торгов: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

Телефоны антикризисного управляющего ЧУП «Аналитик – центр»: (8017) 284 05 66, (8017) 284 05 67, (8029) 670 56 16.

Утерянные бланки страховых полисов формы 2РН серия КЕн №№0041147–0041149 считать недействительными. УНП 100985903

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СТРОЙКОМПЛЕКС»

Предмет торгов	Начальная цена	Размер задатка
Изолированное помещение (инв. №100/D-128334) – двухкомнатная квартира, пл. 56,6 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Брест ул. Фомина 12-9	67 355,00 рублей	1560,00 рублей

Условия продажи	Без условий
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк», Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245

Аукцион состоится 27 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

Последний день приема заявлений – 26 июня 2017 г. до 17.00

■ Аднаўляльная энергія

ІДЭАЛЬНЫ ВЕЦЕР ДЛЯ ЛОПАСЦІ

Роўна год назад у Беларусі пачаў дзейнічаць першы ветрапарк пад Навагрудкам

Фота Надзеі БУЖАН.

ШЭСЦЬ ветракоў установлены на Пуцэвіцкай гары, якая лічыцца адным з самых высокіх пунктаў Беларусі — 300 м над узроўнем Балтыйскага мора. А вышыня кожнай ветраэлектраўстаноўкі, як і размах лопасцяў, складае амаль 90 метраў.

Дарэчы, парк з'явіўся не на пустым месцы. Адзін вятрак тут быў устаноўлены яшчэ ў 2011 годзе. Пасля некалькіх год яго эксплуатацыі Мінэнерга прыняла рашэнне ўвесці ў строй ветраэлектрастанцыю. Адным захадам былі змантаваны яшчэ пяць установак, якія пачалі працаваць 16 чэрвеня 2016 года. Усе яны прыбылі з Кітая і з'яўляюцца самымі магутнымі па выпрацоўцы электраэнергіі ў нашай краіне. Кожны вятрак разлічаны на 1,5 мегавата, агульная магутнасць — 9 мегават. Згодна з планам, за год станцыя павінна выпрацоўваць 21,6 млн кВт·г электраэнергіі. Гэтага хопіць, каб пакрыць чвэрць патрэбы Навагрудскага раёна. Кожная ўстаноўка акупіць сябе праз 12—15 гадоў, затраты на праект склалі 19 млн долараў. Станцыя павінна забяспечыць беларускай энергасістэме штогадовую эканомію 4,5 млн кубоў прыроднага газу.

Пакуль ветрапарк толькі выходзіць на зададзеную магутнасць. Станцыя задзейнічана на 40%, паведаміў **начальнік ветрапарка Андрэй ЦІСКОЎ.** Тут чакаюць ідэальнага ветру, які б дасягаў 10—15 м/с., хоць лопасці пачынаюць працаваць і пры 3 м/с. А вось парывы да 25 недапушчальныя, бо могуць вывесці са строю агрэгат. У гэты момант вятрак аўтаматычна адключаецца. Дарэчы, такі выпадак здарыўся падчас леташняга чэрвеньскага ўрагану, калі станцыя поўнасцю спыніла работу. У гэтым годзе самыя моцныя парывы адзначаліся ў красавіку, але шкоды ветракам яны не нанеслі. А вось самым «правальным» аказаўся студзень гэтага года, бо надвор'е было амаль бязветраным. Цяпер ветравы дыяпазон дазваляе выпрацоўваць запланаваныя кілаватгадзіны.

У хуткім часе на ўзвышшы можа з'явіцца яшчэ адзін вятрак, які мае намер устанавіць Мінпрыроды. Яго магутнасць будзе большая амаль удвая. Прадстаўнікі міністэрства разам з энергетыкамі-праектантамі рыхтуюць дакументацыю для чарговага аб'екта. Яшчэ адзін вятрак установлены прыватным прадпрыемствам.

Андрэй Ціскоў паведаміў, што існуючы парк будзе пашырацца. Ёсць намер павялічыць яго ўдвая. Праўда, з цягам часу гэта зрабіць усе складаней. Тут трэба ўлічваць і ахоўныя зоны, і газаправод, і населеныя пункты, і разараныя калгасам землі. Тым не менш, распрацоўваецца праект яшчэ на пяць ветраэнергетычных установак, якія размесцяцца на дадзеным узвышшы.

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

Наша даведка

15 чэрвеня — Сусветны дзень ветру. Сёлета спаўняецца 10 гадоў з моманту ўстанаўлення гэтага свята, сутнасць якога — больш поўна выкарыстоўваць энергію ветру. Лідзіруюць у гэтым напрамку Кітай, Германія і ЗША, яшчэ 80 краін паспяхова ўкараняюць у сябе ветраўстаноўкі. У Беларусі крыху больш за 60 ветракоў агульнай магутнасцю 50 мегават.

КАРМІЦЬ — СМАЧНА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Аб'екты грамадскага харчавання на дарогах краіны запатрабаваныя, і іх колькасць дастатковая, — лічыць Ларыса Камарова. — Калі браць усталяваны стандарт — на 30—50 кіламетраў адзін аб'ект, — то ў нас па краіне сёння адна падобная адзінка на 28 кіламетраў трасы. За 2011—2015 гады адлегласць паміж аб'ектамі скарацілася на 5,4 км, або на 16%.

На яе думку, заахвочваць кліентаў неабходна якасцю і культурай абслугоўвання. Гэтага можна дасягнуць дзякуючы канкурэнцыі, паколькі толькі пакупнік рэгулюе рынак у гэтай сферы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

План у іх дастаткова амбіцыйны: сёлета яны сабраліся заключыць інвестыцыйныя дагаворы з двума аблвыканкамамі, каб ім выдзелілі зямельныя ўчасткі пад будаўніцтва, — адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі Сяргей ЛЯВОНЧЫК**. — Перспектывы ў іх такія: спачатку зрабіць электразапраўкі на трасах М1 і М2, каб арганізаваць міжнародны маршрут для руху электракараў. Потым яны гатовыя перайсці на астатнія магістралі і ў абласныя цэнтры».

Па словах Сяргея Лявончыка, у планах інвестара арганізаваць 20 электразаправак на вышэйназваных трасах. У будучыні гэтая арганізацыя жадае стварыць сетку падобных станцый па ўсёй краіне — усяго каля 500 заправак. «Але гэта будзе адбывацца ў залежнасці ад развіцця рынку, таму што сёння ў нас невялікая колькасць зарэгістраваных электрамабіляў. Складана таксама падлічыць, колькі падобных машын транзітам перасякае нашу краіну», — дадаў спецыяліст.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

На яе думку, **начальніка аддзела маркетынгу і якасці турысцкіх паслуг дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Ганны МУХІ**, развіццю прыдарожнага сэрвісу і сферы грамадскага харчавання дапамагае павелічэнне патоку турыстаў. «Пасля падпісання кіраўніком дзяржавы ўказа аб бязвізавым уездзе грамадзян 80 краін назіраецца такая тэндэнцыя: па сітуацыі на сённяшні дзень нашу краіну наведалі, скарыстаўшыся гэтым указам, каля 23 тысяч чалавек (па апошняй інфармацыі — 25 тысяч. — **Заўв. аўт.**). Гэта грамадзяне з 65 краін свету, — адзначыла Ганна Муха. — Таму мы адзначаем рост цікавасці да Беларусі з боку замежных гасцей з увядзеннем бязвізавага рэжыму».

Перспектыўным фактарам, які можа прыцягнуць турыстаў у нашу краіну, з'яўляецца наяўнасць электразаправачных станцый, колькасць якіх у хуткім часе можа павялічыцца ў разы. «Да нас звярнулася прыватная кампанія, якая стварае электрычныя зарадныя станцыі ў Расіі і еўрапейскіх краінах.

■ Чулі?!

На МАЗе сабралі «мега-пыласос»

Магутную машыну для прыборкі гарадскіх вулічных дарог стварылі на Мінскім аўтазаводзе. Упершыню яна была прадэманстравана на форуме WasteTech-2017 па кіраванні адходамі, прыродаахоўных тэхналогіях і аднаўляльнай энергетыцы, што праходзіў на мінулым тыдні ў Маскве.

Унікальная падмятальна-прыбіральная машына МАЗ-5917В2-F10 сабрана сумесна з нямецкімі партнёрамі. Яна спраўляецца практычна з любым дарожным пакрыццём, прычым за раз здольная ачысціць палатно шырынёй у 2,3 метра. «Мега-пыласос» таксама ўвільгатняе паверхню і збірае пыл. Машына атрымлівае каманды з пульта непасрэдна ў кабіне. Звонку таксама прадугледжана дадатковая панэль кіравання, якая знаходзіцца паміж кабінай і кузавам. Акрамя таго, яна гатовая да любых умоў эксплуатацыі: можа быць аднолькава эфектыўная як у паўднёвых краінах, так і ў паўночных рэгіёнах.

«Узаемадзеянне з нямецкім вытворцам дазволіла нам стварыць адну з найлепшых падмятальна-прыбіральных машын у сваім класе. З яе дапамогай можна вырашаць практычна любыя задачы па прыбіранні дарог у населеных пунктах. Тым самым мы не толькі пашыраем асартымент тэхнікі МАЗ, але і ўмацоўваем свае пазіцыі ў перспектыўных сегментах рынку спецтэхнікі», — адзначылі ў прэс-службе Мінскага аўтазавода. Вядома, што новая мадэль зможа знайсці прымяненне не толькі ў Беларусі. Машыну плануецца пастаўляць у Расію і іншыя краіны СНД. Акрамя таго, яна, магчыма, зоймецца і ачысткай еўрапейскіх гарадоў.

Акрамя падмятальна-прыбіральнай машыны, МАЗ паказаў смеццявоз МАЗ-590314-N10 і каналапамывачную машыну МАЗ-4926W2-L30. Смеццявоз выпушчаны сумесна з галандскімі партнёрамі. Яго можна выкарыстоўваць для збору як дробных адходаў, так і буйнагабарытных матэрыялаў. Сярод інавацый — спецыяльная надбудова з задняй загрузкай і вельмі магутным прэсам, здольным сціскаць любыя прадметы. Калі ў звычайным смеццявозе каэфіцыент ушчыльнення вар'іруецца ад дзвюх з паловай да шасці адзінак, то ў новай машыне можа дасягаць рэкордных сямі. Другая машына створана сумесна з дацкай кампаніяй. Яна здольная прамываць і чысціць ліўневыя і гаспадарча-бытавыя каналізацыйныя сеткі дыяметрам да 600 мм. Для прамывання выкарыстоўваецца помпа высокага ціску, якая накіроўвае ў каналізацыю струмень вады пад ціскам да 160 атмасфер. Навінкі ўжо ў хуткім часе могуць з'явіцца ў Беларусі і іншых краінах свету.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

ДОНАРСТВА БЕСКАРЫСЛІВАЕ

Наша краіна працягвае рухацца ў бок добраахвотнага бязвыплатнага донарства

Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе да 2020 года перайсці на стопрацэнтнае добраахвотнае бязвыплатнае донарства. Многія краіны паставілі для сябе такую мэту, наша — не выключэнне, бо толькі такое донарства лічыцца максімальна бяспечным. Пра гэта спецыялісты нагадалі ў Сусветны дзень донара крыві.

«Мы не насаджаем гэта, але спадзяёмся на водгук у тым ліку ў нашых патэнцыйных донараў, разлічваем на развіццё карпарацыйнай культуры донарства, калі падобная практыка будзе прэстыжнай для прадпрыемстваў, — заўважае **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар КАРПЕНКА.** — Паступова ў нас адбываецца рост бязвыплатнага донарства, сёлета такіх донараў ужо каля 25 працэнтаў. Надалей плануецца ўкараніць замежную практыку прысвоення ганаровага статусу толькі тым, хто здае кроў без матэрыяльнага заахвочвання».

За апошнія два гады колькасць донараў выраслa на 10 тысяч і склала 95 тысяч чалавек. Звычайна на працягу года каля 20 працэнтаў — навічкі. Колькасць донараў і аб'ёмы нарыхтоўкі лічацца дастатковымі для забеспячэння краіны прадуктамі крыві. Па выніках мінулага года на адну тысячу жыхароў краіны нарыхтавана каля 23 л донарскай крыві (па стандарце САА3 для гарантавання нацыянальнай бяспекі неабходна не менш за 20 л).

Заменнікі крыві пакуль, на жаль, не вынайдзены, а кожнаму чацвёртаму пятаму жыхару планеты патрабуецца пераліванне тых ці іншых яе кампанентаў. Перш чым стаць донарам, неабходна прадаставіць даведку аб стане здароўя з паліклінікі па месцы жыхарства. Абследаванне на маркёры інфекцыйных захворванняў праводзіцца ўжо ў цэнтры трансфузіялогіі, пасля чаго адбываецца нарыхтоўка крыві. Бяспека крыві гарантуецца сёння некалькімі тэхналогіямі, адна з якіх пачала ўкараняцца сёлета. Усе яны забяспечваюць стопрацэнтную гарантыю адсутнасці перадачы такіх інфекцый, як вірусныя гепатыты В і С, сіфіліс або ВІЧ.

— Любая сур'ёзная аперацыя мае на ўвазе страту крыві, і таму яна не можа быць распачата без запасу той жа плазмы, — кажа **галоўны хірург Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Сяргей ЗАРЭЦКІ.** — У лячэбных установах сёння працуюць кабінеты трансфузіялогіі, у якіх ёсць сутачны запас крыві. У цэлым хірургія скіравана на тое, каб як мага менш выкарыстоўваць пераліванне, бо гэта, па сутнасці, перасадка чужароднай тканкі, а значыць, яно можа быць прыроўнена да хірургічнай аперацыі. Мы прымяняем сёння і аўтапераліванні ўласнай крыві, якая забіраецца ў пацыента перад аперацыяй, захоўваецца і выкарыстоўваецца ў выпадку кровастраты. Існуе яшчэ і магчымасць забору крыві, якая страчваецца падчас аперацыі, яна «ачышчаецца» і ўліваецца назад пацыенту. Калі гэтага недастаткова або ўзнікаюць ускладненні, то мы будзем вымушаны пераліваць донарскую кроў. Развіццё сучасных малаінвазіўных тэхналогій скіравана на тое, каб мінімізаваць страты крыві і выпадкі пералівання донарскай крыві.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

Сямейная газета

Выпуск № 11 (78)

НЯПРАВІЛЬНЫЯ ЁЛКІ

Падчас адпачынку я пазнаёмілася ў гарах з даўншыфтарам. Ілья пайшоў з напружанай работы, каб весці больш простае жыццё. Бо лічыць, што час важнейшы за любыя грошы. І лепш працаваць менш і быць шчаслівым, чым шмат зарабляць, выконваючы нервовую працу, якая не прыносіць задавальнення. Само слова «даўншыфтынг» перакладаецца з англійскай як «пераключэнне аўтамабіля на больш нізкую перадачу».

Паспяховага рымскага імператара Дыяклеціяна, дарэчы, таксама можна назваць даўншыфтарам. Пасля 20 гадоў праўлення ён адмовіўся ад улады, пераехаў у свой маёнтак і стаў вырошчваць... капусту. Праз 8 гадоў людзі прыйшлі прасіць яго вярнуцца на трон, але пачулі ў адказ: «Калі б вы бачылі, якая ў мяне выросла капуста, то не сталі б угаворваць».

Верачка, колькі яе ведаю, заўсёды была непапраўным «трактарам». Не паспела завяршыць адзін праект, тут жа «ўпрагалася» ў некалькі чарговых. І вось перад Новым годам яна паставіла сабе сумны дыягназ: «Я перастала атрымліваць задавальненне ад любімай працы. Ды і наогул ад жыцця». Як высветлілася, прычына ў вялікай нагрузцы, дэдлайнах. Прыяцельку з галавой накрыла такая дэпрэсія, што яна набралася смеласці і нечакана для ўсіх перайшла на паніжаную хуткасць.

Не, я не заклікаю ўсіх стаць даўншыфтарамі. Ды і сама не рвуся туды. Бо ведаю на прыкладзе сваёй сяброўкі (ёй хутка надакучыла такое размеранае існаванне), што гэта падыходзіць далёка не для кожнага чалавека. Я — за няспынны рух і развіццё, але пры ўмеранай хуткасці, без небяспечных заносаў-крайнасцяў.

Яшчэ Арыстоцель казаў, што правільнасць шляху, па якім ты ідзеш, вызначаецца тым, наколькі ты шчаслівы, ідучы па ім. Але ж уяўленне пра шчасце ў кожнага сваё...

Неяк адзін бізнесмен стаяў на пірсе ў маленькай вёсачцы і назіраў за рыбаком у старым чаўне. Калі той злавіў вялізнага тунца, павіншаваў яго з поспехам і спытаў, колькі часу патрэбна, каб злавіць такую рыбіну. «Пару гадзін, не больш, — пачуў у адказ. — Чаму ж ты не застаўся ў моры даўжэй і не злавіў яшчэ некалькі такіх рыбак? — здзівіўся бізнесмен. — Адной дастаткова, каб мая сям'я пражыла заўтрашні дзень, — адказаў той. — Але што ж ты робіш увесь астатні час? — не сунімаўся бізнесмен. — Няспешна прачынаюся, снедаю, затым іду на пару гадзін парыбачыць, па вяртанні гуляю са сваімі дзецьмі, пасля мы з маёй жонкай уладкоўваем сабе сіесту, затым шпацырую па вёсцы, увечары іграю са сваімі сябрамі на гітары. Я атрымліваю асалоду ад жыцця. — Дзіўны ты, — сказаў бізнесмен, — я дапамагу табе, ты ўсё робіш не так. Ты павінен увесь дзень рыбачыць і потым купіць сабе вялікі човен. — І што потым? — Потым ты будзеш лавіць яшчэ больш рыбы і зможаш купіць сабе некалькі чаўноў, нават караблёў, і ў адзін цудоўны дзень у цябе будзе цэлая флатылія. — А пасля? — Потым, замест таго, каб самому лавіць рыбу, ты ноймеш іншых рыбакоў. — А пасля? — Потым ты пакінеш гэтую богам забытую вёсачку і пераедзеш у вялікі горад, і, быць можа, аднойчы ты зможаш адкрыць велізарную фірму і быць там дырэктарам. — І колькі ўсё гэта зойме часу? — 15—20 гадоў. — І што ж потым? — А потым, — засмяяўся бізнесмен, — наступіць самае прыемнае. Ты зможаш прадаць сваю фірму за некалькі мільёнаў і стаць вельмі багатым. — А пасля? — Потым ты зможаш перастаць працаваць, пераедзеш у маленькую вёсачку на ўзбярэжжы, будзеш няспешна прачынацца і снедаць, трохі рыбачыць, гуляць з дзецьмі, ладзіць сіесту з жонкай, шпацыраваць па вёсцы, па вечарах іграць са сваімі сябрамі на гітары...»

«Можна страціць усё сваё жыццё, зарабляючы сабе статус, — казаў Барыс Грабеншчыкоў у сваёй перадачы. — Праблема толькі ў тым, што пакуль ты яго зарабляеш, час ідзе. І, зарабіўшы свой рай на зямлі, ты высвятляеш, што ён зусім не рай, ды і карыстацца ім ты ўжо не ў стане. Вельмі позна. Калі радасць сама ішла табе ў рукі, ты ад яе адмахваўся і зарабляў грошы. Калі ж грошы апынуліся ў кішэні, што ты можаш на іх купіць? Толькі імітацыю. Як у старым анекдоце пра няправільныя ёлкі. І ёлкі быццам бы тыя ж, і цацкі. А радасці ніякай».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

nadzieja@zviazda.by

■ Ведай нашых!

Чараўніца чорна-белых клавіш

Сямігадовая піяністка-вундэркінд з Салігорска сваім выступленнем адкрыла «Джазавыя вечары» каля сталічнай Ратушы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Назіраць за ігрой Сафіі Курловіч — адно задавальненне. Яна, як і многія славутыя джазмены, напявае сабе пад нос ноты і свае прыдуманыя словы. Так яна расказвае гісторыю, якую выстуквае пальцамі. Цікава, што дзяўчынка музіцыруе без педаляў. Яна настолькі маленькая, што пакуль не дастае да іх.

Джазам Сафія займаецца ўсяго 2 гады. Па прафесіі бацькі зорачкі зусім не музыканты. Як прызналася Соня, у музычную школу яе прывяла цёця. «Паглядзела, што яна рухавая, — кажа Наталля Кобава, — Сафійка ў нас не толькі іграе на піяніна, але і танцуе, і спявае, таму папрасіла, каб мая калега, якая выкладае джаз, пазаймалася з ёй».

Нягледзячы на свой юны ўзрост, джаз-піяністка ўжо перамагла ў шматлікіх конкурсах: «Jazz-Time — 2016» у Салігорску, рэспубліканскім — «Талент краіны», расійскім — «Джаз-момант 2016». Выступала на адной сцэне з віртуозным джазменам Ігарам Бутманам, здзівіла сваім талентам вядучага перадачы «Лепш за ўсіх». Пасля таго як дзяўчынка сыграла джазавую п'есу, Максім Галкін усклікнуў: «Гэта было так лёгка і вытанчана! Уяўляеце, яна перад выступленнем размаўляла са мной і наігрывала штосьці левай рукой у сябе на падоле сукенкі, напэўна, будучую мелодыю». Куміры юнай піяністкі — Луі Армстронг і Чык Карыя. Дзяўчынка прызналася, што марыць пра чорны раяль, а таксама хоча стаць знакамітай артысткай. Паглядзіце, як яна іграе *(на сайце «Звязды», там жа і больш здымкаў)*, і пераканаецеся, што ў гэтай маленькай зорачкі вялікая будучыня ■

■ Пераадоленне

НЕ ЧАКАЙЦЕ ЦУДУ, СТВАРАЙЦЕ ЯГО САМІ

Як маці дапамагла сыну, які пасля аперацыі страціў зрок, стаць рамеснікам

Арцёму Стоцкаму ўсяго 26 гадоў. Пасля заканчэння ўніверсітэта ён працаваў інжынерам-механікам у Наваполацку, паралельна вучыўся ў магістратуры. І, як і большасць маладых людзей, будаваў грандыёзныя планы на будучыню: марыў пра паспяховую кар'еру, уласны дом, дружную сям'ю... Але два гады таму здарылася няшчасце, у галаве Арцёма знайшлі вялікую пухліну. І хоць яна была дабраякасная, прагнозы ўрачы рабілі не надта радасныя. На шчасце, пухліну ўдалося выдаліць. Але хлопец страціў зрок. Спачатку было вельмі складана прыняць гэтае выпрабаванне не толькі яму, але і яго маці. «Я дні і ночы плакала ў падушку. Пытанне «чаму гэта здарылася менавіта з намі?» не давала спакою. Але аднаго дня сын падышоў да мяне і сказаў: «Мама, хопіць плакаць, так мы далёка не прасунемся».

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Уся сям'я радуецца поспеху Арцёма.

■ Сітуацыя

«Я ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, АЛЕСЯ!»

Іншаземец пераехаў у Беларусь дзеля дачкі

У канцы зімы маленькая Алеся святкуе дзень нараджэння. Сёлета сваё васьмігоддзе дзяўчынка адзначала без бацькі. Так было летась і залетась таксама. Ці ёсць у Алесі тата? Ёсць, і ён не курыць, не п'е, не гуляе. Вядома, купляе падарункі. Але запрасіць у госці яго нельга. Ці дзяўчынка не хоча? Ужо 5 гадоў не спыняюцца суды, скаргі, экспертызы. Аб'ём справавых дакументаў таўсцейшы за «Вайну і мір». Мунір Амар судзіцца, каб бачыцца з дачкой часцей. Дзеля сваёй крывінкі мужчына кінуў заакіянскую краіну, удалы юрыдычны бізнес, вывучыў рускую мову і 8 гадоў жыве ў Беларусі.

Наступствы аднаго кахання

Мунір і Алена пазнаёміліся ва ўсходняй казцы, Арабскіх Эміратах. Паміж імі ўспыхнула каханне. Дачка Алеся нарадзілася ў Беларусі. Праз тры гады сям'я распалася. Мірна падзяліць дзяўчынку не змаглі. Мунір хацеў бачыць дачку часцей і сам-насам. Алена хвалявалася, каб ён не вывез малую за мяжу, перажывала, бо іншаземец быў глухі да просьбаў Алесі, яе жаданняў. Скончыліся часы, калі сям'я весела падарожнічала па Еўропе і Афрыцы, а двухгадовая дзяўчынка бесклапотна спявала разам з бацькам англійскія песні, гуляла з ім у пясочніцы і была самай юнай чытачкай у гарадской бібліятэцы.

«Любіць — гэта не заўсёды настойліва быць побач, часам любіць — гэта сціснуўшы зубы адпусціць дзеля спакою таго, каго любіш».

Гэту гісторыю СМІ асвятлялі не раз. Праляцелі гады, а сітуацыя не павярнулася ў лепшы бок — яна стала горшай. Таго пакоя, пра які журналісты пісалі «мара любой дзяўчынкі», «казка для любога дзіцяці», перапоўненага цацкамі, яркімі кніжкамі, больш не існуе. Мунір пераехаў у меншую кватэру, але кожную ляльку, кожную кофтачку, кожны дзіцячы малюнак сваёй дачкі захоўвае дагэтуль. Для бацькі маўклівыя рэчы-сведкі шчаслівага жыцця з дачушкай — да слёз важная памяць.

У сваю чаргу Алена перажывае, калі бачыць, што перад выхадам да бацькі дачка сумуе, нават плача. «Якімі цудоўнымі былі б гэтыя сустрэчы, як бы лёгка стала жыць Алесі, калі б Мунір не быў глухі да яе жаданняў! За 5 гадзін, адведзеных судом у суботу, дзяўчынка хоча і паесці, і проста павесяліцца з аднагодкамі. Не можа яна столькі часу не адрывацца ад бацькі. Алесі 8 гадоў. Яна мае ўласнае меркаванне, свой свет. А Мунір кіруецца сляпой любоўю, эгаізмам. Калі дачка гаворыць пра сваё жаданне наведаць кіно, ён адказвае: «Гэта мама табе так загадала? Ну?! Алена, што на гэты раз ты дазволіш нам зрабіць?!» Тады Алеся зрываецца на крык: «Не, мама ні пры чым!» І Мунір пры ёй тэлефануе псіхолагу, судоваму выканаўцу. Маўляў, Алеся — ахвяра псіхалагічнага гвалту. Дзяўчынка плача, ёй балюча зноў і зноў праходзіць праз гутаркі са спецыялістамі, сорамна перад аднакласнікамі. Калі на ёй не акцэнтуюць увагу, то ўсе адзначаюць шчаслівы стан Алесі. Яна проста радуецца жыццю і не хоча цяжкасцяў, якія прыносіць сваімі паводзінамі Мунір. Я мару адпусціць гэты негатыў», — дзеліцца сваім болем маці.

Кожнае пятае хворае на неўроз дзіця перажыло разлуку з бацькам. Асабліва востра яе перажываюць дзяўчаткі ва ўзросце ад двух да пяці гадоў.

Алесю спытаюць праз два гады

У 2012 годзе адбыўся першы суд, які дазволіў бацьку бачыцца з дачкой тры разы на тыдзень у прысутнасці маці. Чарговы суд вырашыў дадаць да гэтых сустрэч сумеснае правядзенне сямейных і дзяржаўных свят. Разбіранні працягваюцца.

Псіхолагі падкрэсліваюць: дзень нараджэння Алесі павінен адзначацца без таты, бо існуе востры канфлікт паміж бацькамі. Мунір мае права бачыцца з дачкой дзве гадзіны ў святочныя дні, але яму не падабаецца настрой дзяўчынкі, якая энтузіязму не праяўляе. Ён лічыць вінаватай у сапсаваных адносінах Алену, якая яшчэ два гады вымушана жыць з цяжарам на душы: суд слухае меркаванне толькі дзесяцігадовых дзяцей. Спецыялісты з аддзела адукацыі падкрэсліваюць: камфорт для дзіцяці — гэта пастаянная прысутнасць маці.

У Беларусі 49% моладзі ва ўзросце ад 18 да 26 гадоў галоўнай драмай дзяцінства лічаць развод бацькоў.

«Прабачце за параўнанне, але зняволеных у турме можна наведваць без чыёйсьці прысутнасці. Нават там ніхто не ўказвае, што вам можна сказаць, што нельга, і, вядома, ніхто не цісне на чалавека, якога вы прыйшлі наведаць, — гаворыць Мунір. — У маёй сітуацыі бачыцца з дачкой у прысутнасці маці — тое ж самае, што бачыцца ў прысутнасці чалавека, які супраць адносін з бацькам. Алеся стала марыянеткай».

Псіхалагічная экспертыза паказала, што Мунір можа выхоўваць дачку (у тым ліку без прысутнасці маці).

Бацька таксама чалавек

Як паведамілі супрацоўнікі Белстата, статыстыка выпадкаў прысуджэння дзіцяці пасля разводу тату з'яўляецца вузкай, а таму не праводзіцца. На самай справе ў такой статыстыцы патрэбы няма. Толькі ў выключных выпадках (маці алкагалічка ці сама адмаўляецца ад малога) дзіця пакідаюць бацьку.

Многія дзеці не маюць нікога, хто б біўся за іх увагу і хацеў навучыць усяму, што ведае і ўмее сам. Дзяўчынка мае ажно дваіх.

Алегу Бакуліну, кіраўніку рэспубліканскага аб'яднання «Абарона правоў бацькоў і дзяцей», за дзень тэлефануе дзясятак мужчын. Актыўнасць беларускіх бацькаў у імкненні выхоўваць сваіх малых вельмі высокая, яна расце штогод. «Мужчына любіць дзяцей не менш за жанчыну і гатовы змагацца за іх увагу да апошняга. Тут няма розніцы, іншаземец ён ці беларус», — кажа юрыст.

Паводле даных брытанскага грамадскага аб'яднання, 50% мужчын пасля разводу губляюць сувязь з дзецьмі.

Амаль 20-гадовы вопыт аб'яднання паказвае, што гісторыя Муніра — гэта анамалія. «Да трох гадоў Алесяй займаўся Мунір. Ён вёў інтэрнэт-старонку, дзе публікаваў фота кшталту «першая лыжка кашы», «нашы першыя крокі», «першыя словы», «любімыя гульні», — гаворыць Алег Бакулін.

«З-за чаго бацьку могуць абмежаваць у сустрэчах з дзіцем?» — пытаюся.

«Прычыны тры, — адказвае Алег Бакулін. — Псіхалагічная ненармальнасць, крымінальная судзімасць бацькі і малы ўзрост дзіцяці».

«Мужчыны рэдка дабіваюцца права бачыцца з дзіцем сам-насам, праводзіць разам святы, адпачынак?» — цікаўлюся.

«Дабіваюцца заўсёды!» — чую ў адказ.

Як пісаў Леў Талстой

«Калі цягаць дзяўчынку да псіхолагаў і ўмешвацца ў яе дзяцінства ў кампаніі судовых выканаўцаў, то наўрад ці даб'ешся яе прыхільнасці і любові, ці не так? — лічыць сямейны псіхолог Вольга Фралова. — Любіць — гэта не заўсёды настойліва быць побач, часам любіць — гэта сціснуўшы зубы адпусціць дзеля спакою таго, каго любіш. Калі ласка, прыйдзі, але тады, калі табе адчыняць дзверы. Хочаш добрых адносін з дзіцем — паважай і шукай агульную мову з яго маці. Можна судзіцца і 20 гадоў, але спакою не будзе, суд не мае сілы ў пытаннях прыязні, добрых адносін, сяброўства, любові».

Як бы ні вырашыўся гэты канфлікт, калі-небудзь Алеся вырасце, і, стаўшы дарослай, скажа сваё слова. Многія дзеці не маюць нікога, хто б біўся за іх увагу і хацеў навучыць усяму, што ведае і ўмее сам. Дзяўчынка мае ажно дваіх, больш за тое: яна мае дзве вялікія сям'і, адну ў роднай Беларусі, другую — у іншым паўшар'і, далёка за акіянам.

Пытаю: «Мунір, чаму б вам не кінуць усё, не вярнуцца на радзіму і не стварыць там новую сям'ю, не нарадзіць другое дзіця?»

Ён адказвае: «Дзяцінства — гэта дзяцінства. Непаўторны час, самы важны, як пісаў Леў Талстой. Незабыўная пара ў жыцці дзіцяці і яго бацькоў. Я павінен быць побач з маёй дачкой».

Гісторыя застаецца адкрытай. А пакуль Мунір Амар рады яшчэ адной плацоўцы, дзе ён можа сказаць: «Я люблю цябе, Алеся!»

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

** Імёны герояў публікацыі зменены па этычных прычынах*

■

■ Нататкі таткі

Чаму трэба абавязкова вучыць сына біцца

«Тата, а мяне Максім абзываў і біўся», — пажаліўся сын, калі я забіраў яго з садка. «Вазьмі наступным разам і лясні яму як мае быць!» — першая парада, што прыйшла мне ў галаву. Мае словы выпадкова пачула выхавальніца і развохкалася: «Тата! Як вам не сорамна! Чаму вы дзіця вучыце?!» Высветлілася, што заахвочваю сына да агрэсіі і што кепскага хлопчыка трэба не біць у адказ, а сказаць пра яго выхавальніку. З аднаго боку, педагог нібы і мае рацыю: градус агрэсіі ў грамадстве трэба зніжаць. З іншага — уся мая бацькоўская існасць бунтуе: я размазню гадую ці мужчыну?

Сам я ў садок амаль не хадзіў і ўпершыню з калектывам сутыкнуўся ў школе. І не магу сказаць, што мне гэта дужа спадабалася. Я гадаваўся ў досыць інтэлігентнай сям'і, дзе высвятляць адносіны кулакамі ды мацюкамі было не прынята і дзяцей вучылі быць культурнымі і ветлівымі. А каб кагосьці збіць або зняважыць — крый божа! Але калі на мяне пасыпаліся першыя пстрычкі, кухталі і выспяткі, я зразумеў, што гэткая светапоглядная сістэма пры ўсёй сваёй высокай этычнасці мае адну загану: вельмі балюча і крыўдна. Для мяне стала адкрыццём, што чалавека можна ўдарыць, зневажыць проста так, без дай прычыны, толькі таму, што ён выглядае слабейшым і не праяўляе агрэсіі. Высветлілася, што ў іншых сем'ях культывуюцца зусім іншыя каштоўнасці: хто паспеў — той і з'еў. Закон джунгляў. І нягледзячы на сваё прозвішча, я доўга не мог прыстасавацца да гэтых парадкаў.

Псіхалагічныя траўмы маленства — самыя трывалыя. І калі ў цябе, дарослага дзевяностакілаграмовага дзядзькі, з'яўляецца ўласны сын, то ты міжволі хочаш засцерагчы яго ад паўтарэння сваіх колішніх памылак. І вучыш яго «жыццю»: калі нехта ўдарыць — дай здачы! «А мне выхавальніца сказала, што біцца нельга, што трэба ёй пажаліцца, каб яна на яго насварылася...» — чую ад сына, і хочацца лезці на сценку: што ж вы робіце, таварышы педагогі!

Можа, я сапраўды занадта згушчаю фарбы і разважаю, нібы галоўны герой серыяла «Фізрук», які ўсе праблемы намагаецца вырашыць наскокам і грубай сілай. Можа, сапраўды трэба вучыць дзіця дамаўляцца і шукаць кампраміс. Усё-ткі дваццаць першае стагоддзе на дварэ, а ты, даражэнькі, хадзіў у школу акурат у 90-я, калі агрэсія ў грамадстве біла фантанам з усіх дзірак. Цяпер грамадства змянілася дый дзеці сталі іншыя: сядзяць у інтэрнэтах і асвойваюць гаджэты. Можа, і сапраўды маюць рацыю педагогі: не трэба выхоўваць у дзіцяці культ сілы?

Але, папрацаваўшы ў журналістыцы, грамадства бачыш з розных бакоў. І сустракаеш як годных людзей, так і тых, хто не выклікае ў цябе станоўчых эмоцый. Дзеці ёсць як у першых, так і ў другіх, але гадуюцца яны ў зусім розных каштоўнасных сістэмах. І няма ніякае гарантыі, што твой сын не сутыкнецца з гэткімі ж самымі праявамі, да якіх у свой час не мог прывыкнуць ты. Больш за тое, я ўпэўнены, што ў кожным класе знойдзецца сама меней адзін «кепскі» хлопчык, ад якога будуць стагнаць педагогі і цярпець іншыя вучні.

І не кажыце, што мой сын будзе пад пільным наглядам настаўнікаў. Хоць бы таму, што за кожным прасачыць настаўнік не можа чыста фізічна. А яшчэ ў школе ёсць закуткі, раздзявальні пры спартзалах ды іншыя месцы, дзе можна ладзіць «дзедаўшчыну», не прыцягваючы ўвагі дарослых. Але кпіны і здзекі адразу спыняюцца, калі крыўдзіцелі сутыкаюцца з рашучым адлупам: ахвяра перастае быць зручнай.

У той самы час я, калі што якое, не буду казаць дзіцяці: «Ты што, не мужык? Сам разабрацца не можаш?» А буду хадзіць у школу і дабівацца таго, каб ніхто не смеў зневажаць майго сына. Бо пакінуць яго сам-насам з праблемай — гэта найгоршае, што можа зрабіць бацька.

І нават калі сын трапіць у добры клас у прыстойнай школе, усё адно трэба змалку тлумачыць яму, што ёсць добрыя людзі, а ёсць кепскія. І што з апошнім часам даводзіцца размаўляць на зразумелай ім мове. Нават калі такі выпадак бывае ўсяго раз на жыццё. Але ж ніхто не ведае, калі ён можа надарыцца.

На мой погляд, гэта і ёсць ідэал сапраўднага шляхетнага мужчыны — чалавека, які паважае сябе, здольны абараніць сябе і блізкіх, але пры гэтым ніколі не стане крыўдзіць і зневажаць слабейшых. Магчыма, ідэал крыху архаічны, але ў наш час гэтай здаровай архаікі часта не стае.

Валянцін БОЙКА

■

У пошуку розніцы паміж Гродна і Рымам

Часам нават адно пытанне можа завесці туды, куды не завядзе тузін іншых. Варта толькі, каб было яно неадчэпным.

ПАМЯТАЕЦЦА, Марк Твэн сваім падарожжам у Рым абураўся так з'едліва і таленавіта, што гэта яго абурэнне разам з сотнямі старонак іншых падарожных нататак распаўсюджвалася па падпісцы. «Што я магу ўбачыць у Рыме такога, чаго не бачылі іншыя? — пытаў ён. — Да чаго такога я магу тут дакрануцца, чаго не краналіся да мяне? Што я тут магу зразумець, адчуць, пра што даведацца, чым захапіцца раней, чым гэта здарыцца з некім яшчэ?» І адказваў: «Нічога». Бо лічыў асалодай бачыць у падарожжах нешта такое, чаго ніхто да яго не бачыў. Любая іншая асалода ў параўнанні з гэтай падавалася яму прэснай, любое іншае шчасце — танным.

Едзем, спадарства, у Гродна — амаль што Рым.

Зоф'я НАЛКОЎСКАЯ, самая прыгожая пісьменніца XX стагоддзя, у маладосці.

Паслядоўнікам

Музей Зоф'і Налкоўскай у Гродне — адзіны такі ў свеце. У Польшчы, у Гурках Валоменскіх, дзе пісьменніца нарадзілася, існуе музей сям'і Налкоўскіх — бацькі, Вацлава Налкоўскага, выдатнага навукоўца-географа, палітыка і публіцыста, і дочак — Гані Налкоўскай, вядомага скульптара, работы якой захоўваюцца ў Палацы на вадзе ў Лазенках, і Зоф'і Налкоўскай, пісьменніцы і дэмакраткі. Асобны яе музей існуе толькі ў нас. Чаму? «Пяць гадоў жыцця Налкоўскай на крэсах знайшлі адлюстраванне ў паўвекавым перыядзе яе творчасці», — чытаю ў працы прафесара Святланы Мусіенкі, па запрашэнні якой і наведваецца згаданы музей. «...Чым далей у мінулае адыходзіў гродзенскі перыяд яе жыцця, тым актыўней яго падзеі выкарыстоўваліся ў яе творах», — чытаю далей. Гэта ўсё, безумоўна, адказы, але ў людзей цікаўных заўсёды ёсць прага да розных удакладненняў.

Творчасць гэтай пісьменніцы, спрэс палітызаваная, мае на дзіва простую форму — амаль што «пункціры», але змест, укладзены ў «пункціры», з'яўляецца ўзорам: вучыцеся — чым прасцей, тым мацней. Але каб так пісаць раманы — ствараючы ў міжрадкоўі псіхалагічныя мадэлі і філасофскія сімвалы, — трэба перажыць тое, што давялося перажыць пані Зоф'і. Нават за тыя няпоўныя пяць гадоў, пражытыя ёю ў Гродне.

Экскурсія, зладжаная ў музеі Зоф'і Налкоўскай прафесарам Святланай Мусіенкай, нагадала захапляльную лекцыю па гісторыі, літаратуры, гісторыі літаратуры і гісторыях жыццяў вялікіх жанчын, лёсы якіх з лёсам Гродна ўзаемадатычныя, — Элізы Ажэшкі, Стэфаніі Семпалоўскай, Зоф'і Налкоўскай...

Музей размешчаны ў будынку ўніверсітэта імя Янкі Купалы, але наведваюць яго не толькі студэнты-паланісты. Аўтарка гэтых радкоў выказвае вялікую ўдзячнасць гаспадыні музея — за справу, якую яна вядзе, за памяць, якую яна захоўвае, за веды, якія яна распаўсюджвае.

Што мы можам убачыць у ім такога, чаго не бачылі іншыя? Да чаго такога можам там дакрануцца, чаго не краналі да нас? Што там зразумеем, адчуем, чым захопімся ў эксклюзіўным парадку?

Падрыхтаваўшыся да падарожжа як след, некаторыя адметнасці гэтага горада можна ўбачыць іншымі вачыма. Прачытаўшы, напрыклад, эсэ «Гродна» польскай пісьменніцы Зоф'і Налкоўскай — невялічкае памерам і вельмі важкае зместам.

Першы раз яна ўбачыла Гродна ў 1922-м, яшчэ не папраўленае пасля Першай сусветнай, ды ў ліста-падзе — у гэты, вобразна кажучы, позні вечар года, калі думкі перайманоць адценні ў аб'ектаў прыроды, у час, калі, бадай, ніякі горад у нашай мясцовасці ўпершыню лепш не бачыць. Стагоддзі малявалі на гэтым месцы чароўныя вобразы, пісала яна, стагоддзямі яны тут мяняліся, а цяпер пануюць бязладдзе і бруд беднай сучаснай вуліцы. Шкарлупіна штодзённасці завесіла вывескамі дзвярныя рамы палацаў, зафарбавала каштоўныя фрэскі ў касцёлах, замуравала ганак, каб зладзіць тут якую-небудзь крамку.

Пражыўшы тут менш чым пяць гадоў, з «вечара» 1922-га да «раніцы» 1927-га, Зоф'я Налкоўская прыехала сюды яшчэ на некалькі дзён у 1929-м, каб зрабіць прыгожую прамову на адкрыцці помніка Элізе Ажэшцы, а потым... Што б яна пасля ні пісала, было адбіткам часу, праведзенага тут. Яшчэ і ў самым канцы 1954-га, за тыдзень да смерці, яна ўспамінала горад, які даў ёй сюжэты, герояў, характары, лёсы, эпітэты і параўнанні.

Яна яго палюбіла. Ён нагадваў ёй цудоўны палімпсест. Пройдземся па ім, гледзячы на ўсё яе вачыма.

ВОСЬ старая знаёмая цётка Каложа — «заўсёды дзіўны, пачарнелы клейнот». Стаіць «высока на самым грэбні берага, пануючы над вакольцай — моцна ўчапіўшыся ў саменькі край бездані наднёманскага яра».

Самае прыгожае месца ў Гродне — Стары замак. Ад ранейшых яго сцен захаваліся рэшткі чорнай цэглы і цяжкіх валуноў — «асабліва там, дзе ў развіліне Нёмана і Гараднічанкі ўзвышалася некалі знешняя вежа». Вы ведалі, што Стары замак — не самы стары, што перабудаваны Баторыем, ён захаваў у сабе ад папярэдніка толькі браму, праз якую ў час жыцця ў Гродне Налкоўскай траплялі ў замак на ваенныя балі? Тэраса замкавага двара, абкружаная некалі сценамі і вежамі, з'яўляецца месцам «невыказнага хараства» — «цудам, які быццам лунае ў паветры, адкрыты ў чароўную далячынь». Зірніце зверху на «глыбокі цёмны Нёман»: вам таксама здаецца, што ён «на павароце робіцца серабрыста-белым»?

Кінуўшы вокам на былыя магнацкія рэзідэнцыі, «якія разбурыў дробны гандаль», на якіх «вісяць шыльды крам», не, не ды падумаеш: ці не сучасніца нам Налкоўская? Прынамсі, з гэтым сваім эсэ спадарыня Зоф'я можа стаць для вандроўніка ў Гродне найлепшым экскурсаводам. Мо варта ўжо надрукаваць яго асобнай брашурай ды прадаваць замест даведнікаў пра горад?..

Але ёсць тут месца, дзе Зоф'я Налкоўская прысутнічае літаральна, — у рукапісных старонках дзённіка і фотаздымках, арыгіналах першадрукаў яе твораў і афіш спектакляў, пастаўленых па яе п'есах, ва ўсім тым, што сабрана з любоўю да яе асобы і творчасці. Яна пасялілася назаўсёды ў музеі, які даследчыца яе слова і лёсу прафесар Святлана Мусіенка стварыла на ўласныя сродкі, сабраўшы ў Беларусі і Польшчы не толькі дакументальныя сведчанні, але і прадметы побыту, шматлікія ўспаміны, з якімі тая эпоха — амаль стагоддзе таму — уяўляецца значна лягчэй, а пісьменніца — бачыцца, як жывая.

Вось яна — яе бронзавы бюст і чорна-белыя фотаздымкі. Самая прыгожая пісьменніца XX стагоддзя. Настолькі прыгожая (і пры гэтым разумная!), што ніводзін мужчына не здольны не закахацца. Жандармскі падпалкоўнік Ян Гажахоўскі таксама не здолеў — ні перад прыгажосцю ўстаяць, ні падпарадкаваць сабе яе розум. Насуперак дзейнасці мужа, яго пасадзе і перакананням, яна абараняе правы вязняў мясцовай турмы, адной з самых страшных на нашым кавалку Еўропы. Яна занатоўвае ў дзённік іх лёсы, пераносіць іх гісторыі на старонкі твораў і робіць такую выснову: не толькі злачынцы павінны несці пакаранне за свае ўчынкі, але і грамадства ўвогуле — бо стварыла для гэтага перадумовы.

Арыгінал першадруку эсэ «Гродна».

Вось кушэтка — бо пані Зоф'я любіла пісаць, паклаўшы на яе ногі, «як дама перыяду Дырэкторыі». Вось будзільнік, зроблены ў Гродне, — раней тут быў гадзіннікавы завод. Вось філіжанка для кавы — такая самая, як тады. І друкарская машынка, і крэслы, і шафа, поўная кніг. Мо пані Зоф'я сышла ненадоўга, мо выбралася пахадзіць уздоўж Гараднічанкі, «што гарэзліва пятляе па горадзе, абы толькі дабрацца да Нёмана», або, крочачы вузкімі вулкамі, падумаць пра нязвыклае перапляценне «ўсіх сіл» і тое, што «ўласціва толькі такому гораду і таму здаецца непаўторным». Яна дакладна тут, недзе побач.

Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.

Акадэмічная, 15. Зоф'я Налкоўская жыла ў гэтым доме на другім паверсе ў кватэры з балконам.

Рамантыкам

Што занесла Зоф'ю Налкоўскую, на той час ужо даволі вядомую ў Польшчы 38-гадовую пісьменніцу, сюды, «у глухамань»? Яна выйшла замуж (другі раз, гэтаксама няўдала і ненадоўга, як першы, але не пра тое размова) і прыехала ў Гродна за мужам-вайскоўцам. Іх кватэра займала другі паверх у доме па сённяшняй Акадэмічнай, 15. І варта адшукаць гэты дом, бо дзверы яго, разныя, драўляныя, — тыя самыя, што былі і тады. Тут, каля дома, дзе жылі жандармскі падпалкоўнік Ян Гажахоўскі з жонкай-пісьменніцай, спыняліся карэты і першыя ў Гродне аўтамабілі. Самы першы, дарэчы, належаў ім. Калі ў Гродна прыязджаў Юзаф Пілсудскі (здаецца, 13 кастрычніка 1923 года), ён гасцяваў у Налкоўскай і Гажахоўскага — уваходзіў у гэтыя дзверы. Іх варта ўбачыць, як варта бачыць шматлікія старыя дзверы ў Рыме або Парыжы. Сфатаграфуйцеся каля іх на памяць аб Гродне, якога раней не ведалі.

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

17-га і 24-га ў гэтым месяцы ў Мінску каля Ратушы — джазавыя вечары. Гэта, спадарства, больш чым чароўна — гэта натхняе і заахвочвае да... да самага рознага, але спрэс цудоўнага, бо толькі такі падарунак можа зрабіць нам сустрэча з горадам не ў шуме і тлуме, да чаго ўжо даўно прызвычаіліся, а ў атмасферы інтрыгі, інтымнасці, лірыкі і яднання.

24—25 чэрвеня ў маёнтку «Дукора» — свята «Купальскае кола». Дзесяць гадоў ладзіцца гэты фэст, і з кожным годам ён усё менш нагадвае канцэрт рок-гуртоў пад адкрытым небам, бо ўсё больш заўзята імкнецца адпавядаць купальскаму святу мары. Вы яшчэ не святкавалі Купалу ў «Дукоры»? А вас жа там чакаюць...

24—25 чэрвеня ў Нясвіжы — традыцыйныя вечары опернага і балетнага мастацтва. Што гэтым разам дае наш Вялікі ў знакамітым Радзівілаўскім доме? Па сутнасці, можна збірацца на гэтыя вечары, не ведаючы рэпертуара. Гэта няведанне можна нават наўмысна ператварыць у «фішку», і той, хто яшчэ не наведваў такое мерапрыемства, будзе мець два сюрпрызы адразу.

17 чэрвеня ў Нідэрландах свята сцяжкоў або селядцоў. Раней селядзец не лічыўся прыстойнай ежай для добрага люду, цяпер жа добры люд гатовы ехаць ажно ў Галандыю, каб толькі адчуць, як гэта смачна і радасна — накіраваць сабе ў рот толькі што пасолены селядзец, маляўніча трымаючы яго за хвост. Папытаеце, для чаго сцяжкі? Імі ўпрыгожваюць гавані.

12 ліпеня ў фінскім горадзе з пяшчотнай для нашага вуха назвай Котка пройдзе Марскі фестываль. Котку трэба шукаць на мяжы з Расіяй. Ад Санкт-Пецярбурга ўжо не настолькі далёка, каб, раптам трапіўшы ў апошні горад, паленавацца трапіць і ў першы. Кажуць, што свята гэта сямейнае, утульнае і прытым самае вялікае летняе свята ў Фінляндыі. Мо і праўда паехаць?

НЕ ЧАКАЙЦЕ ЦУДУ, СТВАРАЙЦЕ ЯГО САМІ

Хлопец не замыкаецца ў чатырох сценах. Арыентавацца на вуліцы яму дапамагаюць мама, сябры, белы кіёк і навігатар.

«Месяцаў шэсць я змагаўся з гэтымі трубачкамі»

Пасля аперацыі Арцём пераехаў жыць да бацькоў у віцебскую двухпакаёўку. У кватэры хлопец арыентуецца вельмі добра. Калі б я не ведала, то адразу і не зразумела б, што ён нічога не бачыць. Больш за тое, міміка ў Арцёма цудоўна развітая, пры размове ён глядзіць у вочы, пастаянна усміхаецца, жартуе.

Ва ўсіх пакоях прыцягваюць увагу вырабы з папяровай лазы. Чаго тут толькі няма: і вытанчаныя цукерніцы, і кошыкі для цацак ды бялізны, шкатулкі для біжутэрыі, падносы, хлебніцы самых розных памераў і формаў... Усё зроблена надзвычай акуратна. На кожным вырабе вісіць паперка з нейкім натхняльным надпісам: «Не чакайце цуду, стварайце яго самі», «Свет належыць таму, хто яму рады...»

«Да хваробы былі іншыя думкі.
Як бы зарабіць грошай пабольш.
Эгаістам быў у гэтым плане.
А цяпер усё памянялася».

Звярнула ўвагу, што многія плеценыя рэчы з густам аздоблены рознакаляровымі стужкамі ды пацеркамі.

— Адчуваецца жаночая рука...

— Так, за дэкор у нас адказвае мама, — пацвярджае маю здагадку Арцём.

— У нашым тандэме сын — гэта рукі, а я — вочы, — усміхаецца Вольга Мікалаеўна. — Мая задача пафарбаваць трубачкі, якія Арцём скруціў, у розныя колеры. І раскласці іх па спецыяльна адведзеных месцах. Бачыце, зверху ляжаць карычневыя, з левага боку — блакітныя, а ўнізе — жоўтыя.

Арцём не хавае, што тое, чаго ён дасягнуў, у вялікай ступені заслуга маці і айчыма.

— Мама адразу ж пайшла з працы, каб дапамагчы мне аднавіцца пасля аперацыі. А Мікалай падтрымлівае нас маральна і матэрыяльна. Без яго мы дакладна не справіліся б.

— Пасля аперацыі правая частка цела ў Арцёма была паралізаваная. Каб распрацоўваць пальцы рук, купілі гітару і пачалі вучыцца на ёй іграць. Паралельна я шукала ў інтэрнэце, што б яшчэ можна было рабіць рукамі. Знайшла пляценне з лазы. Арцём загарэўся. Ужо вырашылі, што на лецішчы лазу пасадзім, як зусім выпадкова выскачыла спасылка на вырабы з папяровай лазы. Такія неймаверныя рэчы робяць людзі! Нават спачатку цяжка паверыць, што яны сплеценыя са звычайнай паперы. Мы таксама вырашылі паспрабаваць.

— Летась, вясной, паехалі на лецішча і пачалі вучыцца круціць трубачкі, — працягвае Арцём. — Гэта толькі на першы погляд падаецца, што ўсё проста. Памятаю, гадзіна прайшла, са ста трубачак толькі 20 было нармальных, а ўсе астатнія то танчэйшыя, то таўсцейшыя, то не так скручаны, то не так склеены.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Сапраўды, пачынаць было няпроста. Першыя вырабы атрымліваліся не вельмі якаснымі. Але Арцём не здаваўся. Месяцаў шэсць змагаўся з гэтымі трубачкамі. Але, калі пачало атрымлівацца, ужо стала цікава.

— Маме вельмі ўдзячны за цярпенне. Каб я асвоіў нейкі новы спосаб пляцення, яна мала таго, што павінна была сама навучыцца плесці, дык яшчэ і тлумачыла мне ўсё на словах.

— Малайчына. Аптыміст, канешне, ён у нас. Не шукае лёгкіх шляхоў. Вось гэтыя незвычайныя формы *(паказвае)* ён сам прыдумаў. Я нават так і не ўмею рабіць.

«Бяда нас вельмі зблізіла»

Арцём, актыўны чалавек па натуры, не хацеў сядзець у чатырох сценах. Таму практычна адразу пасля таго, як зноў пачаў хадзіць, папрасіў адвесці яго ў цэнтр рэабілітацыі інвалідаў па зроку.

— Гэта першае месца, куды мы выйшлі ў людзі. Там яго зусім бясплатна навучылі арыентавацца ў прасторы пры дапамозе белага кійка і GPS-навігацыі, карыстацца праграмай з агучкай у інтэрнэце *(Арцём стварыў ва УКантакце суполку, дзе выстаўляе здымкі сваіх вырабаў)*.

Потым, зусім выпадкова, лёс звёў з Вольгай Анатолеўнай Дазорцавай, якая працуе ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага гарвыканкама. Менавіта ад яе мы і даведаліся пра магчымасць атрымаць бязвыплатную субсідыю для развіцця сваёй справы. У снежні пачалі пісаць бізнес-план, потым абаранялі свае работы перад камісіяй. Столькі было радасці, калі атрымалі афіцыйны статус рамесніка і каля дзвюх тысяч рублёў. За гэтыя грошы мы цалкам абсталявалі працоўнае месца Арцёму, набылі неабходныя інструменты, матэрыялы...

— Гляджу я на вас і радуюся, паміж вамі пануе такое ўзаемаразуменне. Да таго, як Арцём страціў зрок, адносіны былі такімі ж блізкімі?

— Я яго гадавала адна з двух з паловай гадоў. Таму, калі вучыўся ў школе, быў мамчыным сынком.

— Калі падрос, мне, як, думаю, большасці маладых людзей, захацелася свабоды. Я нават паступаў у Полацкі ўніверсітэт, каб адарвацца ад дому, быць незалежным. Вось ты такі малады і запатрабаваны, а пасля аперацыі расплюшчваеш вочы і... нічога не бачыш. Хочаш падняцца, а не можаш... І табе дапамагаюць блізкія людзі. Пераацэнка адбываецца глабальная. Пачынаеш даражыць тым, што маеш. Вельмі зблізіла нас з мамай гэта бяда.

— Восьмага сакавіка сын пайшоў сабаку выгульваць. Вяртаецца неўзабаве з букетам кветак. Кажа: «Мама, са святам цябе». Я нават праслязілася ад шчасця. Гэта быў першы раз, калі Арцём пасля аперацыі адзін схадзіў у краму. Я радуюся кожнай перамозе сына. Але разам з тым і хвалююся вельмі. Далёка ад дома страшна аднаго адпускаць. А ён рвецца, кажа: «Я пайду асвойваць новы маршрут». Арцём выходзіць з кватэры, а я непрыкметна следам. Ён адчувае. Азіраецца, просіць, каб ішла дадому.

— А сабакам-павадыром не думалі абзавесціся?

— Ён каштуе дорага, дзесьці 20 тысяч долараў.

— Як я жартаваў, за гэтыя грошы можна каму-небудзь кватэру падарыць, і ён цябе вадзіць будзе, — дадае хлопец.

— Арцём, а са сваімі старымі сябрамі падтрымліваеш стасункі?

— Практычна ўсе хлопцы, з якімі ён сябраваў, з'яўляюцца тут. Выходзяць разам гуляць на вуліцу, — далучаецца да размовы Мікалай. — Наташа прыходзіць, дзяўчына, з якой яны сябруюць ужо даўно.

— Ці будзе сябраваць з намі чалавек, залежыць толькі ад нашых учынкаў. Калі будуць нейкія дрэнныя ўчынкі ў адносінах да яго, то і сяброўства не будзе. У цэнтры рэабілітацыі я пазнаёміўся з многімі цікавымі людзьмі. Найбольш цесна сябруем з Дзімам Халадовічам, ён толькі на некалькі гадоў старэйшы за мяне. Хлопец практычна нічога не бачыць, але тым не менш вядзе актыўны лад жыцця: выкладае ў цэнтры рэабілітацыі, адзін вандруе па свеце. Ён вельмі стымулюе мяне сваім прыкладам.

«Той, хто хоча жыць, шукае магчымасці, а не адгаворкі»

— Што можаш параіць людзям, якія апынуліся ў такой сітуацыі, як ты?

— Мне вельмі падабаецца фраза «калі не можаш змяніць сітуацыю, змяні стаўленне да яе». Усё залежыць ад нашага жадання. Той, хто хоча, шукае магчымасці. Хто не хоча — адгаворкі. Тое ж самае і з хваробай. Некага цяжкасці могуць зламаць. А нехта дзякуючы ім становіцца мацнейшы. Вось Нік Вуйчыч, напрыклад, не мае ні рук і ні ног, але тым не менш жыве на поўную, у яго ёсць жонка, дзеці. Ён ездзіць па свеце са сваімі лекцыямі, натхняе іншых сваім прыкладам. Я з задавальненнем слухаю яго кнігі, шмат чаму вучуся, Нік дапамагае не сумнявацца ў сваіх сілах. Вось толькі адна сітуацыя. У якасці падарунка жанчынам на 8 Сакавіка прафсаюзная арганізацыя з мамінай былой працы вырашыла заказаць у мяне цукерніцы, ажно 14 штук. Калі мама мне пра гэта сказала, гатовых было толькі чатыры.

— Я пачала хвалявацца, што не паспеем справіцца, бо заставалася ўсяго некалькі дзён, думала нават адмовіць. Прыйшла дадому, а Арцём кажа: «Тэлефануй, скажы, што паспеем». Цэлыя суткі напралёт сядзеў, плёў, але паспеў. Гэта быў яго першы такі вялікі заказ і заробак.

Цяпер малады рамеснік актыўна рыхтуецца да «Славянскага базару».

— Самую ж галоўную плату атрымаў літаральна за дзве гадзіны да вашага прыходу. Прыйшла смска ад жанчыны, якая заказала хлебніцу і невялічкі кошык для цыбулі: «Дзякуй вам вялікі за вашу работу. Усё вельмі спадабалася. Поспехаў ва ўсіх вашых пачынаннях». Мне вельмі прыемна, што людзям падабаюцца мае вырабы. Хачу быць карысным іншым, дарыць радасць.

— Ты так заўсёды думаў, ці толькі цяпер сталі такія думкі з'яўляцца?

— Да хваробы былі іншыя думкі. Як бы зарабіць грошай пабольш. Эгаістам быў у гэтым плане. А цяпер усё памянялася. Там, пэўна, пакруцілі штосьці падчас аперацыі ў мозгу.

Арцём прызнаўся, што па-ранейшаму марыць пра дружную сям'ю, дзяцей. Але перш, чым рабіць каханай прапанову, хоча рэалізавацца, цвёрда стаць на ногі. Каб не сядзець ні ў кога на шыі, а самому забяспечваць сям'ю.

Пасля размовы мы разам пайшлі выгульваць сабаку Ніку. Па дарозе хлопец паказаў, як асвойвае навігатар. Пастаянна жартаваў, расказваў анекдоты.

Арцём з аптымізмам стараецца глядзець наперад. Цяпер актыўна рыхтуецца да «Славянскага базару». Гэта першы кірмаш у жыцці маладога рамесніка, таму крыху хвалюецца. «Я нават ужо прадумаў сабе вобраз. Капялюш сплёў, неўзабаве прымуся за лапці. Хочацца, каб людзі глядзелі на мяне ды мае вырабы і радаваліся. Ведаеш, пасля аперацыі я зразумеў, што трэба жыць «тут і цяпер». Па максімуму старацца рэалізоўваць сябе сёння. Мінулае ўжо было, будучыні яшчэ няма. Ніколі не ведаеш, які дзень стане для цябе апошнім. Калі сядзіш у чатырох сценах без справы, то дурныя думкі ў галаву лезуць. Таму ў любога чалавека павінна быць нейкая мэта.

Планы ў хлопца, вядома, змяніліся пасля аперацыі. Але яны не менш грандыёзныя.

— Калі я не мог хадзіць, мне параілі наняць масажыста, каб распрацаваць правую частку цела. Шчыра, я не думаў, што масаж мне дапаможа, але, як бачыце, цалкам аднавіўся. Хапіла двух курсаў. Жанчына, якая робіць мне масаж, неяк спыталася, ці не хачу я таксама асвоіць масажныя тэхнікі. Маўляў, невідушчыя спецыялісты цэняцца ў свеце, бо ў іх высокая адчувальнасць рук. Я загарэўся гэтай ідэяй. Масаж жа — гэта таксама дапамога людзям. Вось зараз кручу трубачкі і паралельна слухаю аўдыякнігу — паўтараю школьныя тэрміны па біялогіі. У таварыстве інвалідаў па зроку падказалі, што ў Гродне знаходзіцца вучылішча, дзе вучаць на масажыста. Там ёсць група, адзіная ў Беларусі, для людзей, у якіх праблемы са зрокам. Мне трэба будзе здаваць два экзамены: па біялогіі і мове. У жніўні паедзем з мамай на падрыхтоўчыя курсы.

На развітанне я запыталася ў Арцёма, ці верыць ён у цуды. «Мой сябар Дзіма сказаў, што ў Ізраілі робяць аперацыю па нарошчванні сятчаткі. Але гэта вельмі дорага каштуе. Тым не менш я не губляю надзеі. Калі слухаў аўдыякнігу пра архімандрыта, там вельмі шмат гісторый невытлумачальных, цудадзейных. Верыць ці не, кожны вырашае сам. Я веру. Але пры гэтым не чакаю цуду склаўшы рукі, а «цуджу» сам».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by
Мінск-Віцебск.

Анекдот ад Арцёма

У адной сям'і нарадзіліся хлопчыкі-блізняты. Ах і Ох. Ах быў весялун, а Ох, наадварот, пастаянна быў усім незадаволены. І вось ім спаўняецца па пяць гадоў. Бацькі вырашылі выпрабаваць стойкасць іх характараў. Ноччу, напярэдадні дня нараджэння, яны паклалі пад ложак песіміста прыгожага драўлянага коніка, а аптымісту паставілі гаршчок, даверху напоўнены конскім гноем. Раніцай Ох зазірае пад ложак, дастае цацку і кажа: «Ох, конік... Ён жа драўляны, а я хацеў жывога...» Аптыміст дастае з-пад ложка гаршчок і радасна кажа: «Ах! А ў мяне жывы! Толькі выйшаў пагуляць!»

Научно-методическое учреждение
«Национальный институт образования» Министерства образования Республики Беларусь
объявляет прием в аспирантуру и докторантуру за счет средств республиканского бюджета на 2017 год

СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:

09.00.11 «Социальная философия» (1 место на обучение в дневной форме);
13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (2 места: 1 место на обучение в заочной форме, 1 место на обучение в форме соискательства);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (5 мест: 1 место на обучение в дневной форме, 1 место на обучение в заочной форме, 3 места на обучение в форме соискательства);
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (1 место на обучение в дневной форме);
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии» (1 место на обучение в форме соискательства);
19.00.07 «Педагогическая психология» (2 места: 1 место на обучение в заочной форме, 1 место на обучение в форме соискательства).

Срок обучения в аспирантуре: в дневной форме – до 3 лет, в заочной форме – до 4 лет, в форме соискательства – до 5 лет.
Поступающие в аспирантуру для получения научной квалификации «Исследователь» в дневной и заочной формах получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления в аспирантуру.
Поступающие в аспирантуру должны иметь опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования, либо рекомендацию ученого совета (совета) учреждения высшего образования или факультета учреждения (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении).
Для поступающих на обучение в форме соискательства опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования, является обязательным.
Поступающие в аспирантуру для обучения в дневной и заочной формах получения образования сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования. Для получения послевузовского образования в аспирантуре в форме соискательства сдача вступительного экзамена не требуется.

СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ:

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (1 место на обучение в дневной форме);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (1 место на обучение в форме соискательства).
В докторантуру принимаются лица, имеющие ученую степень кандидата наук и являющиеся авторами научных исследований, которые составят основу докторской диссертации с возможностью ее завершения в период обучения.

Срок обучения в докторантуре в дневной форме – до 3 лет, в форме соискательства – до 5 лет.

ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ ТАКЖЕ ПОДГОТОВКА ДОКТОРОВ И КАНДИДАТОВ НАУК НА ПЛАТНОЙ ОСНОВЕ.

Прием документов – с 1 августа по 29 сентября.
Вступительные испытания будут проходить с 2 по 20 октября.
Начало занятий – 1 ноября.

С условиями приема можно ознакомиться в разделе «Аспирантура / Докторантура» образовательного портала Национального института образования (адрес портала: *www.adu.by*).

Обращаться по адресу:
220004, г. Минск, ул. Короля, 16, каб. 110.
Контактные телефоны: +375 (17) 200 53 38, +375 (17) 229 19 59.

УНП 190374888 ***Дирекция института***

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»
АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР НА 2017 ГОД У АСПІРАНТУРУ

ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму для атрымання паслявузаўскай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па наступных спецыяльнасцях:

АСПІРАНТУРА

Шыфр і назва спецыяльнасці	Форма атрымання адукацыі	Колькасць бюджэтных месцаў
17.00.01 – тэатральнае мастацтва	дзённая	1
17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура	дзённая	1
17.00.06 – тэхнічная эстэтыка і дызайн	дзённая саіскальніцтва	1 1

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» ажыццяўляе прыём у аспірантуру і дактарантуру для атрымання паслявузаўскай адукацыі (дзённая, завочная формы, саіскальніцтва) за кошт юрыдычных і фізічных асоб на платнай аснове.

Дакументы для паступлення прымаюцца з 1 жніўня па 30 верасня 2017 года па адрасе: 220012, г. Мінск, вул. Сурганава, 14а, кабінет 508.

Падрабязная інфармацыя – на сайце ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» **(http://bdam.by/graduate_school/)** і па тэлефонах: **+375 17 331 70 08, +375 44 579 73 38.**

УНП 100289132

Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка Генеральной прокуратуры Республики Беларусь
(г. Минск, ул. Захарова, 76)
объявляет набор в докторантуру в 2017 г.
по специальностям:

12.00.08 – уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право (1 место);
12.00.09 – уголовный процесс (1 место);
12.00.11 – судебная деятельность; прокурорская деятельность, правозащитная и правоохранительная деятельность (1 место);
12.00.12 – криминалистика; судебно-экспертная деятельность; оперативно-розыскная деятельность (1 место).

Форма обучения: соискательство (внебюджет).
Дополнительная информация по т./ф. 294 78 80.

УНП 190759862

В 2017 году в аспирантуру учреждения образования
«МОЗЫРСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ И. П. ШАМЯКИНА»
объявлен набор лиц по следующим специальностям:

на дневную форму получения послевузовского образования

Шифр	Специальность	Срок обучения	План приема
01.04.05	Оптика	3 года	1
10.02.02	Русский язык	3 года	3
10.02.01	Белорусский язык	3 года	1
13.00.01	Общая педагогика, история педагогики и образования	3 года	2

на заочную форму получения послевузовского образования

Шифр	Специальность	Срок обучения	План приема
13.00.01	Общая педагогика, история педагогики и образования	4 года	1

Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2017 года по адресу: г. Мозырь, ул. Студенческая, 28, ауд. 220.
Справки по телефону: +375 236 32 43 79.

УНП 400083888

Учреждение образования «Могилевский государственный университет продовольствия»
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ НА 2017 ГОД
по следующим отраслям науки и специальностям научных работников

АСПИРАНТУРА

Шифр и наименование	План приема: дневная форма	заочная форма	соискательство
01.00.00 Физико-математические науки			
01.14.14 Теплофизика и теоретическая теплотехника	–	–	–
02.00.00 Химические науки			
02.00.01 Неорганическая химия	–	–	–
02.00.04 Физическая химия	–	–	–
05.00.00 Технические науки			
05.02.13 Машина, агрегаты и процессы (пищевая промышленность)	–	–	–
05.13.06 Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (промышленность)	–	1	–
05.17.06 Технология и переработка полимеров и композитов	1	–	–
05.18.01 Технология обработки, хранения и переработки злаковых, бобовых культур, крупяных продуктов, плодоовощной продукции и виноградарства	1	–	–
05.18.04 Технология мясных, молочных и рыбных продуктов и холодильных производств	1	–	–
05.18.07 Биотехнология пищевых продуктов и биологических активных веществ	–	–	–
05.18.12 Процессы и аппараты пищевых производств	–	1	–
05.18.15 Технология и товароведение пищевых продуктов, продуктов функционального и специализированного назначения и общественного питания	–	–	–
08.00.00 Экономические науки			
08.00.05 Экономика и управление народным хозяйством	–	–	–

ДОКТОРАНТУРА

Шифр и наименование	План приема: дневная форма	соискательство
05.00.00 Технические науки	–	–
05.18.01 Технология обработки, хранения и переработки злаковых, бобовых культур, крупяных продуктов, плодоовощной продукции и виноградарства	–	–
05.18.12 Процессы и аппараты пищевых производств	–	–

Сверх плана приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета проводится прием на платной основе на все специальности аспирантуры и докторантуры.

Прием документов с 1 по 30 сентября 2017 года.
Справки по тел.: (0222) 47-79-14, (0222) 48-58-06

УНП 700036606

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ»
АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ на 2017 год:

у аспірантуру за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэта на дзённую форму навучання па спецыяльнасці 17.00.02 Музычнае мастацтва. Колькасць месц: 3 – дзённая форма навучання; 1 – у форме саіскальніцтва.

Адначасова ажыццяўляецца прыём у аспірантуру і дактарантуру на платнай аснове.

Прыём дакументаў праводзіцца з 28 жніўня па 29 верасня 2017 года з 10.00 да 13.00; з 14.00 да 17.00.

Субяседаванне і ўступныя экзамены праводзяцца з 9 па 13 кастрычніка 2017 года.

Даведкі па адрасе: г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30, каб. 122; тэл.: 327-11-03; 226-11-76.

УНП 100672776

УО «Белорусская государственная
АКАДЕМИЯ СВЯЗИ»
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		19 441	19 307
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110		2 868	1 070
14	Отложенные налоговые активы	1111		-	
15	Деловая репутация			-	-
16	Прочие активы	1112		11 552	10 703
17	ИТОГО активы	11		412 719	408 335
18	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
19	Средства Национального банка	1201		-	-
20	Средства банков	1202		82 650	84 768
21	Средства клиентов	1203		248 889	247 191
22	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		19 518	17 829
23	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
24	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
25	Прочие обязательства	1207		6 612	6 057
26	ВСЕГО обязательства	120		357 669	355 845
27	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ				
28	Уставный фонд	1211		11 075	11 075
29	Эмиссионный доход	1212		-	-
30	Резервный фонд	1213		6 400	6 400
31	Фонд переоценки статей баланса	1214		9 755	9 836
32	Накопленная прибыль	1215		27 820	25 179
33	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации – банку			55 050	52 490
34	Доля неконтролирующих акционеров			-	-
35	ВСЕГО собственный капитал	121		55 050	52 490
36	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		412 719	408 335

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 1 КВАРТАЛ 2017 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2017 год	2016 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		10 180	11 009
2	Процентные расходы	2012		4 958	5 608
3	Чистые процентные доходы	201		5 222	5 401
4	Комиссионные доходы	2021		2 176	2 125
5	Комиссионные расходы	2022		584	509
6	Чистые комиссионные доходы	202		1 592	1 616
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(42)	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		2 647	4 926
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(701)	(3 419)
11	Чистые отчисления в резервы	207		1 581	3 381
12	Прочие доходы	208		341	1 531
13	Операционные расходы	209		4 291	3 854
14	Прочие расходы	210		283	277
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		2 904	2 543
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		344	702
17	Прибыль (убыток)	2		2 560	1 841
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
20	Итого прибыль (убыток)			2 560	1 841
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации			2 560	1 841
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			-	-
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
24	Базовая прибыль на простую акцию				
25	Разводненная прибыль на простую акцию			-	-

Заместитель Генерального директора С.К. Сабук

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания: 31 мая 2017 года

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
http://www.bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/finansovaya-otchetnostj/otchet-o-pribyli-i-ubytkakh.html

Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь №10 от 7 июня 2013 г.
УНП 100513485

ГУК ДТП «АВТОКОМБИНАТ «ОБЛСЕЛЬСТРОЙ»

извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

№п/п лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20%
1	Грузовой седельный тягач MAZ 5433 A2 320, рег. №АВ 8523-6	4284,00
2	Грузовой седельный тягач MAZ-543302-220, рег №ТС 01-81	3121,20
3	Грузовой самосвал МАЗ 555102-225, рег. №ТВ2907	3427,20
4	Грузовой самосвал МАЗ 555102-225, рег. №ТВ 4058	3427,20
5	Грузовой самосвал МАЗ 555102-225, рег. №ТВ 4057	3427,20
6	Грузовой самосвал МАЗ 555102-225, рег. №ТВ 4492	3916,80
7	Полуприцеп-платформа МАЗ 93802 0-040, рег. №ТВ 3824	1346,40
8	Прицеп-самосвал МАЗ 857100-020, рег. №ТВ 2403	1346,40
9	Прицеп-самосвал МАЗ 857100-020, рег. №ТВ 2650	1346,40
10	Прицеп-самосвал МАЗ 857100-020, рег. №ТВ 2651	1346,40
11	Прицеп-самосвал МАЗ 857100-020, рег. №ТВ 2820	1407,60
12	Прицеп-самосвал МАЗ 857100-024, рег. №ТВ 3823	1040,40
13	Полуприцеп-платформа-площадка ПЭ 1209, рег. №А0791	2142,00
14	Полуприцеп-платформа-панелевоз УПП 1212, рег. №ТА 6261; инв. №14590	979,20
15	Станок токарный винтор 1А	3427,20
16	Полуприцеп-платформа-панелевоз УПП 1212, рег. №ТА 7331	795,60
17	Легковой седан ГАЗ 3110	856,80
18	Прицеп МАЗ 857100-026, рег. №А0090 а-6	1407,60
19	Экскаватор-бульдозер ЭО2621-в-2	1774,80
20	Станок свер. верт.	1836,00

№п/п лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20%
21	Станок Р 105	361,08
22	Молот ковочный	2080,80
23	Пресс 10 шор 17575	208,08
24	Принтер Phaser 3150; инв. №2833	43,95
25	Персональный компьютер «Сильверадо» (комплект с принтером)	128,52
26	Компьютер персональный Itex	128,52
27	Принтер инв. №2862	26,29
28	Компьютер (комплект с принтером)	140,76
29	Стенд 22205-01	373,32
30	Пульт директорской связи	33,51
31	Сварочный аппарат	52,64
32	Телефонная станция	208,08
33	Электроводонагреватель	342,72
34	Кондиционер	208,08
35	Холодильник м367	46,95
36	Мойка	612,00
37	Грузовой самосвал МАЗ 5516 А5-371, рег. №АА8756-6	7344,00
38	Грузовой самосвал МАЗ 5516 А5-371, рег. №АА8757-6	7344,00
39	Пресс ОР-145	79,56
40	станок в/св 271-1181	446,76
41	Станок 2н-125	673,20
42	Станок обдир. шлиф.	465,12

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно четвертый раз.
Публикация об аукционе ранее публиковалась 23.05.2017 г. и 27.05.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 49%.
Окончание приема заявлений в 11.30 26.06.2017

Дата и время проведения торгов	**26 июня 2017 года в 13.30** по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 14
Шаг аукциона	5%
Задаток	10% от начальной стоимости предмета торгов
Место нахождения предмета торгов: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Ровчакова, д. 14 Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: Андрей, тел. +375 44 552 42 92. Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122	
Организатор торгов	ООО «Фрондера», тел. +375 29 395 36 35
Информация о продавце	ГУК ДТП «Автокомбинат «Облсельстрой», Могилевская область, г. Могилев, ул. Ровчакова, д.14 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122)
Условия для участия в торгах	1. До подачи заявления внести задаток на р/с 3012221557014 в ЗАО «Альфа-Банк», код банка 270, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах. 2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah. 3. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. Также победителем подлежат возмещению затраты по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затраты по размещению публикации (согласно выставленному счету). 4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает об открытом аукционе по продаже здания клуба, Минская обл. Молодечненский р-н, Городиловский с/с, д. Городилово

	Начальная цена продажи, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1. Одноэтажное кирпичное здание Городиловского сельского клуба с инв. №630/С-59308. Назначение: здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения. Составные части – блочный подвал, кирпичная мансарда, кирпичная терраса, бетонный тротуар. Г. п. – 1970. Этажность – 1. Общая площадь – 419,4 кв. м. Фундамент – бетонный. Стены наружные, внутренние и перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/бетонные. Крыша – шиферная. Полы – бетонные, дощатые. Проемы оконные – створчатые, решетки. Проемы дверные – филенчатые, окрашены. Внутренняя отделка – оштукатурено. Электроснабжение – скрытая проводка. Вентиляция – естественная	18 360,00	1 830,00

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 623880803601000066, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Городиловский с/с, д. Городилово, пл. 0,1100 га. Назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания Городиловского сельского клуба. Право аренды по 08.08.2021

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Арест. Постановление Главного следственного управления СК Республики Беларусь «О наложении ареста» от 03.12.2012 №б/н. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов.

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество, обращенное в доход государства, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 26.07.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5%

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется: на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369 (**действует до 30.06.2017 г.**); на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X (**действует с 04.07.2017 г.**).
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Здание клуба) (Лот №1), проводимом 26.07.2017 (Молодечненский МРО).
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7, в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00.
Окончание приема заявлений и задатков –24.07.2017 в 11.00.
Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Руденок Валерий Александрович, тел. +375 (44) 529-28-34

Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90.

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 98,9 кв. м (в т. ч. 69,0; 18,5; 9,0; 0,5; 0,9; 1,0 кв. м), расположенных на 1-м этаже капитального строения с инв. №240/С-29422 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Флерова, 6а (здание отделения почтовой связи – 9) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 375,82 руб. **Задаток:** 37,58 руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 17,1 кв. м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №240/С-29422 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Флерова, 6а (здание отделения почтовой связи – 9) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 64,98 руб. **Задаток:** 6,50 руб.

Лот №3. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 19,6 кв. м, расположенных на 2-м этаже капитального строения с инв. №240/С-29422 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Флерова, 6а (здание отделения почтовой связи – 9) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 74,48 руб. **Задаток:** 7,45 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 18.07.2017 в 11.00 по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 15.06.2017 с 8.30. по 17.07.2017 до 17.30.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК 153001117 (с 04.07.2017: р/с BY93MTBK30120001093300066782, IBAN MTBKBY22), УНП 390477566. Конт. тел. (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

■ Наш чалавек

«ШЧАСЦЕ — ГЭТА ДАБРО, ПАМНОЖАНАЕ НА ДАБРО»

З ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Нінай Патапаўнай Міхалевіч з Баранавічаў мы пазнаёміліся ў Бараўлянах, у шпіталі для інвалідаў, трохі пагаварылі, і ўжо гэтай, першай, кароткай размовы з жанчынай хапіла для таго, каб зразумець, наколькі яна мудрая, добрая, шчырая... Ведаючы, што яе велізарны жыццёвы досвед можа стаць карысным для іншых, я папрасіла яе напісаць хоць колькі лістоў-успамінаў. І неўзабаве атрымала першы.

«У цяжкую зіму 1937 года, — *паведамляла Ніна Патапаўна,* — я стала сведкай таго, як мама (у яе было чацвёра дзяцей) папрасіла ў сваёй сястры швейнай машынкі, каб справіць для іх абноўкі. Але сястра... не дала, не пазычыла. Мама тады, вярнуўшыся дадому, павалілася на ложак і горка заплакала... Мне было так шкада яе, так хацелася хоць нечым суцешыць, што я паабяцала: калі падрасту, то абавязкова куплю ёй швейную машынку...

Але ж потым пачалася вайна, і я стала дапамагаць бацьку, які быў сувязным партызанскага атрада: здабывала звесткі аб руху цягнікоў, выконвала іншыя даручэнні і па-ранейшаму марыла, як скончыцца вайна, як добра зажывуць тады людзі і як я спраўджу сваё абяцанне.

З часам мае мары пачалі збывацца. Самым дарагім падарункам да майго 18-годдзя стаў салют Перамогі. Яго я сустрэла ў Лунінцы. Потым мяне накіравалі на працу ў Драгічынскае аддзяленне дзяржбанка. Аднак швейных машынак у продажы не было ні там, ні там.

Праўда, быў... выпадак. Неяк зімой 46-га прыходжу я з працы дадому, каля парога мяне сустракае мама і аб'яўляе: «А ў нас госці!» — «І хто ж такія?» — «Ды не ведаю, як сказаць...»

Аказалася, што на вуліцы яна сустрэла масквічоў, якія прыехалі да сваіх знаёмых, а тыя (хто ж ведае, з якой прычыны?)... не адчынілі ім дзвярэй.

Мама пашкадавала гэтых прыезджых і прывяла дадому.

У нас яны гасцявалі некалькі дзён, а калі з'язджалі назад у Маскву, то вельмі настойліва запрасілі мяне прыехаць да іх. За блізкі свет, здавалася б, да чужых, але ж праз нейкі час я сабралася. Мама для нашых знаёмых накупляла розных гасцінцаў, а да ўсяго — вялікі кумпяк.

З гэтым дабром, абрываючы рукі, я і прыехала ў Маскву да цёткі Капы (так звалі нашу знаёмую), выклала ёй на стол падарункі. Гаспадыня, гледзячы на іх, ахнула: «Я не магу ўсё прыняць... Гэта ж колькі грошай патрачана!»

Карацей, назаўтра, прадаўшы на базары палову кумпяка, цётка Капа ўручыла мне грошы і сказала: «На... Купі сабе тое, аб чым ты марыш».

А мара ў мяне была адна — яшчэ тая, дзіцячая...

Шчыра, як на духу, я расказала пра яе цётцы Капе, і здарыўся сапраўдны цуд: яна недзе знайшла і купіла швейную машынку! Хай не вельмі новую, але ж галоўнае спраўную... Якая ж я была шчаслівая! Уяўляла, як узрадую маму!.. А потым яшчэ і раскажу, як была на дэманстрацыі, як ішла ў першай шарэнзе і нават бачыла Сталіна.

Мама, убачыўшы машынку «Зінгер», сапраўды заплакала, бо яна пра яе ўжо і не марыла...

А шыла потым да канца сваіх дзён.

Цяпер тая самая машынка служыць мне, і я, успамінаючы гісторыю яе з'яўлення ў нашай сям'і, хачу сказаць: шчасце — гэта дабро, памножанае на дабро».

Праз некаторы час Ніна Патапаўна даслала мне другі ліст, дзе апісала яшчэ адну цікавую гісторыю:

«Лунінец 44-га... Позняя восень. У Польшчы ішлі баі за Варшаву, вайскоўцаў па-ранейшаму — эшалон за эшалонам — адпраўлялі на вайну. Але ў нашым горадзе ўжо аднаўлялі разбураныя будынкі і нават у самім паветры адчувалася, што Перамога ўжо блізка-блізка.

А мне тады было 17, і гэта, вядома ж, дыктавала сваё: хацелася жыць, кахаць, танцаваць! Мне вельмі падабалася, калі іграў духавы аркестр!

Неяк з сяброўкамі мы пайшлі ў Клуб чыгуначнікаў. Побач, за яго сценамі, стаялі эшалоны — байцоў адпраўлялі на фронт. Але нехта з іх яшчэ паспяваў зазірнуць на танцы...

Памятаю, як зайграла музыка і як мяне падхапіў, закружыў у вальсе малады афіцэр.

Танцавалі мы вельмі зладжана і прыгожа, так, што спачатку ніхто з прысутных не адважваўся далучыцца: толькі глядзелі.

Мы «прайшлі» адзін круг, другі, і хіба што потым да нас далучыліся іншыя.

Калі музыка сціхла, афіцэр не адпусціў маю руку: зноў запрасіў на танец...

І раптам пранізліва загудзела труба. Але не аркестровая, а тая, што кліча на збор... Веставыя сталі аб'яўляць нумары вайсковых часцей, якія зараз, гэта значыць ужо, адпраўляюцца на фронт.

Ніна Патапаўна МІХАЛЕВІЧ *(справа)* і паэтка Валянціна ПАЛІКАНІНА.

Той афіцэр глядзеў на мяне, трымаў за руку і напружана слухаў.

На гэты раз цуду не здарылася: яго часць назвалі таксама. Ён разгублена ўсміхнуўся, адступіў ад мяне, потым азірнуўся і, гледзячы ў вочы, сказаў: «Я — Бабалян Амбарцум Аерыевіч»...

З тых часоў мінула 73 гады, але памяць мая «трымае» гэта імя. І я дагэтуль думаю: ці жывы той афіцэр? Можа, вальс наш быў яго апошнім танцам, бо ў тую ноч вайскоўцаў везлі на перадавую...

А можа, ён неяк ацалёў? І можа, таксама помніць наш Лунінец, клуб, танец?..»

У трэцім лісце мая знаёмая расказала пра свайго бацьку, які падчас вайны з'яўляўся сувязным партызанскага атрада Яўгена Макарэвіча:

«Быў 1941 год. Мы жылі ў Драгічыне. Памятаю, як да нас прыйшлі два нямецкія афіцэры. Адзін з іх стаў лавіць курэй, а другі, удакладніўшы прозвішча таты, павёў яго ў хату. Там на добрай рускай мове ён расказаў, што ягоны бацька — нямецкі інжынер, да вайны працаваў у Ленінградзе, будаваў масты, што сам ён вучыўся ў савецкай школе, аднак пасля таго, як да ўлады прыйшоў Гітлер, усіх спецыялістаў адклікалі назад у Нямеччыну...

Ён паказаў майму бацьку спіс з прозвішчамі тых, хто дапамагаў партызанам: увесь савецкі актыў. Было там і прозвішча таты: ён яшчэ да вайны стаў членам кампартыі Заходняй Беларусі...

Афіцэр сказаў, каб бацька ішоў у лес, бо праз тры дні па яго прыедуць фашысты. А мы, ягоныя дзеці, павінны тады сказаць, што бацьку ўжо «забралі». Паказаў афіцэр і дом здрадніка, які склаў той спіс...

Праз тры дні да дома і сапраўды пад'ехала машына. З яе выйшаў афіцэр з маноклем і па-нямецку спытаў у мяне: «Дзе твой бацька?» Я адказала, як навучылі, што яго ўзялі тры дні таму. «Гут», — прамовіў немец, сцёбнуў сябе плёткай па боце, сеў у машыну і з'ехаў...

Так, дзякуючы немцам-антыфашыстам, ацалела наша сям'я. А магло ж, крый бог, быць іначай: прыход тых афіцэраў мог аказацца пасткай. Але ж, калі адзін з іх загаварыў па-руску (хоць гэта і было небяспечна), надышоў момант ісціны, бо ў той час нават у думках не дапускалася, што ад немцаў можна чакаць праявы чалавечых пачуццяў, лічылася, што вораг — гэта звер.

Але ж такой была воля Гасподняя...

Мой бацька, — *расказвала далей Ніна Патапаўна,* — усё жыццё сваё імкнуўся жыць па-людску, быў вельмі сумленным і справядлівым чалавекам. Ён пераніс выпрабаванні трох войнаў і дажыў да ста гадоў. У той, соты (!), дзень нараджэння, унучка спытала ў яго, ці ёсць Бог? Дзядуля адказаў ёй: «Ёсць!»

Ведаў ён і сакрэт свайго даўгалецця, сказаў: «Я заўсёды быў моцны духам».

Вось такія лісты, вось такія ўнікальныя гісторыі. Усе яны — з далёкага мінулага, але ж не страцілі сваёй яркасці і вастрыні, таму што памяць чалавечая здольна захоўваць драбнюткія падрабязнасці.

Пройдуць гады — а гэтыя лісты застануцца, іх прачытаюць унукі і праўнукі Ніны Патапаўны. Прачытаюць — і напоўняцца яе дабрынёй.

Каля гэтага ж душэўнага цяпельца я прапаную пагрэцца і чытачам газеты. А дзевяностагадовай Ніне Патапаўне Міхалевіч зычу той самай сілы духу, той самай радасці доўгажыхарства, якія былі ў яе бацькоў... І спадзяюся на новыя лісты!

Валянціна ПАЛІКАНІНА,
г. Мінск

■

■ Нельга забыць

Адзін... З вялікага атрада

У выхадныя, у святы чалавек звычайна дазваляе сабе адпачыць: з'ездзіць у госці, паглядзець кіно, пачытаць... А я — дык схадзіць на могілкі. Там — заміраная цішыня і спакой, там — тужлівае зязюліна «ку-ку», там — магілы маіх родных, сяброў і аднавяскоўцаў: знаёмыя тавары на медальёнах, знаёмыя прозвішчы на помніках.

Углядаюся ў фотаздымак Сяргея Міхайлавіча Слесарава.

Родам ён з Браншчыны, вайсковец, ардэнаносец — адзін з прадстаўнікоў другой хвалі так званых трыццацітысячнікаў, якія ехалі падымаць сельскую гаспадарку.

Сяргей Міхайлавіч такім чынам трапіў у наш Бярэзінскі раён, і можна толькі здагадвацца, як нялёгка яму (гараджаніну і вайскоўцу) даваліся новыя абавязкі. Але ж партыя сказала: трэба — і чалавек упогся ў гэты цяжкі воз, стаў старшынёй калгаса «Пераможац».

Ветлівы, інтэлігентны — людзям ён спадабаўся адразу. Вось толькі прозвішча запомніць вяскоўцы не маглі. Нехта зваў яго Бляхараў, нехта — Жалязнякоў, а ў рэшце ўспаміналі: «Дык жа Слесараў!»

Гаспадарку новы старшыня прыняў, можна сказаць, жабрачкай: нават канторы ў яе не было. Пра тэхніку ніхто і не марыў (грошай на рахунку — нуль): сеялі, жалі, малацілі, бульбу выбіралі ўручную — у асноўным жанчыны і падлеткі. Праўда, коні былі (хоць і без вупражы), ажно 13, дзякуючы конюху, які даглядаў іх, як сваіх.

Апроч гэтага, вясной у новага старшыні не было ні насення, ні арганікі. І калі першае хоць пакрысе, але выдзялялі, то ўгнаенні (у асноўным попел) прыйшлося збіраць па падворках калгаснікаў.

Якія культуры сеяць, як іх даглядаць, як гадаваць жывёлу — гэтыя пытанні патрабавалі ведаў і досведу. І тут галоўнымі «кансультантамі» старшыні сталі вопытныя калгаснікі Андрэй Антонавіч Шалай, Міхаіл Антонавіч Яроцкі, Пётр Васілевіч Астраўлянчык ды іншыя.

Але ж і сам старшыня многа чытаў, ездзіў у больш моцныя гаспадаркі вобласці. Ён жа, каб хоць неяк узбіцца на грошы, на ўсю зіму аддаў у арэнду адзіную машыну, а сам і зімой і летам ездзіў на кані.

У выніку на канец 1954-га калгас «Пераможац» удвоіў (да 8 цэнтнераў з гектара) ураджай збожжавых. На рацэ Кляве (у той час яна была паўнаводнай) з'явіўся млын, па ёй жа сплаўлялі лес.

Праз год калгас за ўласныя грошы набыў другі грузавік. На ім — апроч іншага — жанчыны ездзілі на сенакос. І я памятаю, з якім задавальненнем Сяргей Міхайлавіч іх адпраўляў, абавязкова прасіў: «Пожалуйста, поезжайте с песнями». А жанчын і прасіць не варта было, бо на працу ехалі як на свята.

Потым калгас набыў трактар ДТ-20, з'явіўся будынак канторы, кароўнік, свінарнік, а сярод калгаснікаў — першая стаханаўка: звеннявая Ганна Васілеўна Арлова, якая для павышэння ўраджайнасці лёну ўсю зіму арганізоўвала збор попелу і курынага памёту з падворкаў.

Вось так, крок за крокам, набываючы вопыт, цэнячы і паважаючы людзей, гаспадарыў гэты трыццацітысячнік. А сам жыў сціпла, ездзіў на грамадскім транспарце, разам з жонкай Ганнай Мацвееўнай выхоўваў траіх дзяцей.

...Вёска Капланцы для ўраджэнца Бранскай вобласці стала такім чынам любімым краем. А яшчэ — месцам апошняга спачыну, перад якім з удзячнасцю схіляюць галовы мясцовыя жыхары.

Ніна БУРКО, *Бярэзінскі раён*

■

■ Рэха

Скончылася слаўная гісторыя?

Страшная навіна: згарэў Клюшчанскі касцёл — такі дагледжаны, такі прыбраны... Ён заўсёды чакаў і прымаў усіх, хто прыходзіў да алтара, ён аб'ядноўваў людзей у адну дружную Божую сям'ю.

У мяне з гэтым касцёлам звязаны самыя светлыя і цёплыя ўспаміны: там хрысцілі маіх дзядоў і прадзедаў, там у хоры спявала мая мама, а мой прадзед Адам Валуевіч некалі падарыў касцёлу надзвычай меладычны звон, які везлі аж з Пецярбурга...

Не згарэў храм падчас вайны, выстаяў у гады ваяўнічага атэізму: аднавіўся, адрадзіўся клапатлівымі рукамі парафіян як асяродак не толькі рэлігійнага, але і культурнага жыцця, бо ён, нібы магнітам, прыцягваў да сябе таленавітых святароў: Ян Галіч-Сулінскі — вядомы кампазітар і арганіст, Юзаф Бародзіч — будаўнік, рэстаўратар, ксёндз-лекар і пакутнік Адам Вайцяхоўскі...

«Звязда» ў сваім артыкуле з нагоды згадала і паэта Канстанціна Стаповіча (Казіміра Свояка). Сябра створанага ім «Хаўрусу свякоў» Рамуальд Ракіцкі, вельмі таленавіты мастак-самавук, на франтоне касцёла напісаў абраз «Сэрца Езуса». Штогод пад ім збіраліся людзі з розных куткоў Беларусі, каб малітвай і шчырым словам ушанаваць светлую памяць паэта...

І што ж цяпер? Ніхто ні зблізку ні здалёку ўжо не пачуе славуты звон? Ніхто не залюбуецца прыгожай архітэктурай? Не зойдзе ў гасцінна расчыненыя дзверы? Скончылася слаўная трохсотгадовая гісторыя? Няўжо? Чаму?

Не хочацца ў гэта верыць.

Іаланта ВАЛУЕВІЧ,
Мінскі раён

■

■ Народны гумар

САЛОМУ ЕШ, А ФАСОН ТРЫМАЙ,

або Дубінскія жартачкі

Восьмы раз на Валожыншчыне прайшло раённае свята гумару «Дубінскія жартачкі». Трапіць сюды можна было толькі праз мытню. Кожнага ўдзельніка, госця рэгістравалі: ставілі пячатку на далонь або запясце рукі. Як жартавалі дубінцы, гэтая адзнака дае права наведаць нават Еўрасаюз — ніякая віза не патрэбная. А яшчэ ўсім уручалі дубінскую нацыянальную валюту — 100 долараў, маўляў, мы не разменьваемся на драбязу.

Фота Валянціны КРАЎНЕВІЧ.

— Чаму менавіта ў вёсцы Дубіна́ Баярская ладзіцца фестываль такога кшталту? — пацікавілася ў Тамары Каляды, мясцовага культработніка, вельмі нераўнадушнага да роднай спадчыны чалавека.

— У 1909 годзе збіральнік беларускага фальклору, паэт і публіцыст Стары Улас у сваёй кнізе напісаў літаральна наступнае: «Дзесяць вёрст ад Валожына ёсць вялікае сяло Дубіна, і чутна аб ім далёка-далёка. Мае яно, мусіць, з 300 хат, ёсць там і манаполька, і карчма. Народ вельмі паганы, самыя п'яніцы і зладзеі: не толькі што на дварэ нічога не пакінь, але і з будынку павыцягваюць. У мінулым годзе дык выцягнулі ў Янука Паўлоўскага з пуні сячкарню, яна і прапала. У кудраўскага лесніка Максіма пазнікалі калёсы з восяў... А пабіць каго, дык гэта ў іх нават мода: няхай толькі будзе хто на каго злы або другі папросіць, дык нападуць ці на полі, ці на дарозе, і забіваюць да паўсмерці — ідзі ў Дубіну, там усё гэта знойдзеш...» Мне ж захацелася развеяць гэты міф. Так, Стары Улас убачыў нас тымі вачыма і, магчыма, меў рацыю. Але з таго часу прайшло стагоддзе, змянілася жыццё, людзі сталі іншымі, — кажа Тамара Каляда.

Менавіта Тамара Уладзіміраўна стала родапачынальніцай фестывалю, каб паказаць, што не такія дрэнныя яе землякі: самакрытычныя, жартаўлівыя, могуць пасмяяцца над сваімі недахопамі. (Зрэшты, у каго іх няма?)

Дубінцы заўсёды жылі па прынцыпе: салому еш, а фасон трымай. Гэтую рысу характару прыкмеціў пісьменнік Уладзімір Ліпскі і падказаў Тамары Уладзіміраўне трапную назву для гурта народнага гумару — «Дубінскія фанабэры».

Цяпер жыхары вёскі, вядома, салому выкарыстоўваюць хіба што на подсцілку жывёле, ёсць у іх і хлеб, і да хлеба. Адкрытае акцыянернае таварыства «Дубінское-Агра» — даволі моцная гаспадарка, трымае першае месца ў раёне па надоях малака. З 1995-га ўзначальвае яе Генадзь Каспяровіч. А наогул Генадзь Вацлававіч тут ужо трыццаць два гады, пачынаў працоўную дзейнасць з розных пасад. «Ці задаволены вы працаўнікамі? Няма сярод іх гультаёў, лайдакоў, паганых людзей, як пісаў Стары Улас?» — пацікавілася ў дырэктара.

— Людзі добрыя, працавітыя, шчырыя, гасцінныя. Да нас прыязджаюць замежныя турысты, у тым ліку і з Германіі. **Было тое ці не, а дубінцы дасюль расказваюць байку, нібыта ў вайну немцы праехалі праз вёску толькі адзін раз, ды і то з перапуду крычалі: «Ахтунг, ахтунг, Дубіна!»**

Тым часам свята віравала, гуло: песні, прымаўкі, жарты, гумарэскі так і сыпаліся вакол. Госці і гаспадары падымалі келіхі за «лося» (каб кахалася, вялося, былося). Налягалі на сала, ад якога «душа скакала». А мяне пачаставалі «салоніцай» — бульбай, «фрышткамі» — печывам і «рыфмай» — чаркай гарэлкі і бутэрбродам з салам.

Павіншаваць жыхароў са святам прыехалі суседзі: гурты з вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна «Коласавы землякі», «Свякі» з Валожына ды калектывы з іншых установ культуры раёна. Кожны госць змог знайсці сабе занятак па інтарэсах: дзеці каталіся на атракцыёнах, частаваліся салодкай ватай і марожаным. Дарослыя падпявалі самадзейным артыстам, танцавалі пад вясёлую музыку. А прыхільнікі народнай творчасці з цікавасцю абыходзілі імправізаваныя падворкі, дзе былі выстаўлены работы народных умельцаў: самабраныя абрусы, ручнікі, посцілкі. Ушанавалі падчас свята самага маленькага і самага старога жыхара вёскі.

— Дык якія ж людзі жывуць у Дубіне? — пацікавілася ў жыхароў напрыканцы фестывалю. Яны і расказалі, што дзевак з іх вёскі замуж не бяруць, што ў магазіне ўжо гадоў 40 дэфіцыт на ватоўкі. Як толькі прывязуць — уся вёска ў чарзе стаіць. А дубінскія жанчыны не прызнаюцца, адкуль родам — з-за таго, што нехта калісьці сказаў: «Разумныя людзі ў Дубіне і свіней не купляюць». Вось і зразумей: дзе праўда, а дзе прыдумка...

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

Дубінскі анекдот

Прыйшла Ганна да суседкі:

— Гэлька пазыч мне гароху, свайго не хапіла.

— Дык сама ж летась клялася, што больш ніколі не будзеш яго сеяць, бо ўсё роўна чарвякі з'ядуць.

— Тое ж летась было... А сёлета палову агарода гарохам засею. Хай трушчаць, хай ім праз бакі павылазіць.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.43	17.06
Віцебск —	4.18	21.42	17.24
Магілёў —	4.27	21.34	17.07
Гомель —	4.33	21.21	16.48
Гродна —	4.54	21.57	17.03
Брэст —	5.04	21.48	16.44

Месяц

Апошняя квадра
17 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Івана, Нікіфара.*
К. *СВЯТА БОЖАГА ЦЕЛА І КРЫВІ, Віолы, Іяланта, Яны, Віта, Вітольда, Лявона.*

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

15 ЧЭРВЕНЯ

Сусветны дзень ветру. Адзначаецца па ініцыятыве Еўрапейскай асацыяцыі ветраэнергетыкі і Сусветнага савета па энергіі вятроў з 2007 года.

1215 год — англійскі кароль Ян Беззямельны падпісаў Вялікую хартыю вольнасцяў, якая абмяжоўвала каралеўскую ўладу. Сёння ўваходзіць у лік дзеючых актаў Канстытуцыі Вялікабрытаніі.

1667 год — прафесар матэматыкі, філасофіі і медыцыны Сарбоны Жан-Батыст Дэні ўпершыню выканаў паспяховае пераліванне крыві: ён пераліў 16-гадоваму юнаку, які пакутаваў на ліхаманку, 9 унцый (каля 250 кубічных сантыметраў) крыві ягняці, пасля чаго хворы хутка паправіўся. Гэты факт па праве лічыцца ўнікальным, паколькі аб існуючых групах чалавечай крыві даведаліся толькі праз 250 гадоў. Аднак наступныя спробы Дэні паўтарыць поспех нярэдка прыводзілі да трагічных наступстваў, і пераліванне крыві ў Францыі было забаронена. Толькі ў 1900 годзе аўстрыйскі ўрач Карл Ландштэйнер адкрыў першыя тры групы крыві — A, B і C. Неўзабаве да спіса была дададзена і чацвёртая — AB.

1790 год — нарадзіўся Антоній Ануфрый Плятэр, краязнаўца, археолаг, калекцыянер. З'яўляўся членам Віленскай археалагічнай камісіі. У выніку падарожжаў па Заходняй Дзвіне апісаў помнікі архітэктуры, археалогіі, гістарычныя мясціны, Барысавы камяні. Цікавіўся беларускім фальклорам. Сабраў шмат матэрыялаў з Падзвіння, частку з іх перадаў у Віленскі музей старажытнасцяў. Рукапісы захоўваюцца ў бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта. Памёр у 1862 годзе.

1843 год — нарадзіўся Эдвард Грыг, нарвежскі кампазітар, піяніст, дырыжор. Аўтар музыкі да драмы Г. Ібсена «Пер Гюнт», сюіты для струннага аркестра «З часоў Хольберга», канцэрта для фартэпіяна з аркестрам, струннага квартэта, «Лірычных п'ес» для фартэпіяна, рамансаў і песень. Памёр у 1907 годзе.

1867 год — нарадзіўся Канстанцін Дзмітрыевіч Бальмонт, рускі паэт-сімваліст, адзін са славутых прадстаўнікоў паэзіі Сярэбранага веку. Памёр у 1942 годзе.

1902 год — нарадзіўся (в. Параф'янава, цяпер у Докшыцкім раёне) Ян Бабровіч, публіцыст, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Быў рэдактарам газет «Жыццё беларуса», «Беларуская ніва», «Беларуская справа», «Народная справа» і інш. У 1928 годзе арыштаваны і асуджаны да 15 гадоў турмы. У выніку абмену палітвязнямі ў 1932-м апынуўся ў Савецкай Беларусі, працаваў у Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры АН БССР. У 1933 годзе рэпрэсаваны. Памёр у 1943 годзе ў лагеры. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1956 годзе.

Было сказана

Ніна МАЦЯШ, паэтэса:

«Няма нічога, акрамя жыцця і смерці.
Шлях праўды не закончыцца на мне».

УСМІХНЕМСЯ

Падарунак на вяселле больш правільна было б дарыць праз пяць гадоў шлюбу. Спачатку вы мне даказваеце, што ваша каханне вечнае, а потым я вам нешта купляю.

— У цябе жонка працуе?

— Падзарабляе, некалькі разоў на год, ліквідатарам.

— Што ліквідуе?

— Усякае шмаццё ў гандлёвых цэнтрах падчас сезонных распродажаў.

Калі ваша дзіця, наліваючы чай, нахіляе кружку, вы дапусцілі пару хібаў у выхаванні.

Прыходзіць дадому муж п'яны, жонка на кухні мые посуд. Муж кулаком па стале:

— Хто ў доме гаспадар?!

Жонка яго патэльняй па галаве — бац! Мужык «у адключцы».

Заходзіць суседка:

— А што ў цябе мужык пасярод кухні ляжыць?

— Гаспадар! Дзе хоча, там і ляжыць.

Для тых, хто не ходзіць на першыя пары, таму што рана ўставаць неахвота, паведамляем, што ў войску пад'ём у 6.00.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2268.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12